ПРАЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

Літаратура і Мастацтва

Год выдання 35-ы
№ 84 (2137)
18 кастрычніка 1966 г.
АЎТОРАК
Цана 4 кап.

ОРГАН МІНІСТЭРСТВА КУЛЬТУРЫ І ПРАЎЛЕННЯ САЮЗА ПІСЬМЕННІКАЎ БССР

ВЯЛІКАЯ ДАТА АБАВЯЗВАЕ

ПЛЕНУМ ПРАЎЛЕННЯ САЮЗА МАСТАКОЎ БЕЛАРУСІ

Як выконваюць беларускія мастакі творчыя абавязацельствы па падрыхтоўцы да рэспубліканскай выстаўкі «Народ — партыя — камунізм», прысвечанай пяцідзесяцігоддзю Савецкай дзяржавы, — такі асноўны пункт парадку дня шостага пленума праўлення Саюза мастакоў БССР, што адкрыўся ўчора раніцай у Доме мастацтваў.

З дакладам выступіў старшыня прэзідыума праўлення Саюза мастакоў БССР Ул. Стальмашонак.

Пасля даклада разгарнуліся спрэчкі. У іх прынялі ўдзел П. Белавусаў, В. Гаўрылаў (яго выступленне зачытаў Л. Баразна), І. Стасевіч, Г. Паплаўскі, Л. Кроль, В. Галубовіч, Л. Лейтман, старшыня рэвізійнай камісіі Саюза мастакоў БССР Ул. Пасюкевіч і іншыя.

Пленум працягвае сваю работу.

Справаздача аб пленуме будзе змешчана ў наступным нумары «Літаратуры і мастацтва».

ПОСПЕХ АРШАНЦАЎ У МАСКВЕ

Больш 500 тысяч самадзейных мастацкіх калектываў у краіне, і толькі лепшыя з іх атрымліваюць права выступіць на сцэне Крамлёўскага тэатра ў Маскве.

У кастрычніку такое ганаровае запрашэнне атрымалі артысты народнага тэатра Аршанскага ордэна Леніна льнокамбіната.

Гастролі аршанцаў прайшлі з вялікім поспехам, паведамляе наш карэспандэнт з Масквы. Асабліва спадабаліся масквічам ігра Б. Арлова, Л. Трушко, А. Прылуцкай. Спектакль неаднаразова перапыняўся апладысментамі.

Аршанцы паказалі сваё мастацтва таварышам па прафесіі з «Трохгорнай мануфактуры», пабывалі ў вайсковай часці, якая ў гады вайны прымала ўдзел у вызваленні Беларусі.

ЗАКЛІКІ ЦК КПСС

ДА 49-й ГАДАВІНЫ ВЯЛІКАЙ КАСТРЫЧНІЦКАЙ САЦЫЯЛІСТЫЧНАЙ РЭВАЛЮЦЫІ

1. Няхай жыве 49-я гадавіна Вялікай Кастрычніцкай Сацыялістычнай рэвалюцыі!

2. Слава Вялікаму Кастрычніку, які адкрыў новую эру ў гісторыі чалавецтва — эру крушэння капіталізму і ўсталявання камунізма!

3. Няхай жыве марксізм-ленінізм — вечна жывое ўсёперамагаючае рэвалюцыйнае вучэнне!

4. Працоўныя Савецкага Саюза! Усе сілы на ажыццяўленне рашэнняў XXIII з'езда КПСС, на выкананне пяцігадовага плана!

Наперад да новых перамог у барацьбе за трыумф камунізма ў нашай краіне!

5. Працоўныя Савецкага Саюза! Азнамяную 50-годдзе Вялікага Кастрычніка новымі поспехамі ў камуністычным будаўніцтве!

6. Палымянае прывітанне брацкім камуністычным і рабочым партыям— баявому авангарду рабочага класа і ўсіх працоўных!

7. Няхай жыве адзінства і згуртаванасць міжнароднага камуністычнага руху на аснове марксізма-ленінізма, пралетарскага інтэрнацыяналізму, на аснове Дэкларацыі і Заявы Маскоўскіх нарад!

8. Народы краін сацыялізма, народы, якія вядуць нацыянальна-вызваленчую барацьбу, працоўныя ўсяго свету! Аб'ядноўвайце намаганні ў барацьбе супраць імперыялізму і каланіялізму, за нацыянальнае вызваленне, за мір, дэмакратыю і сацыялізм!

9. Народы ўсіх краін! Выкрывайце падкопы імперыялістычных падпальшчыкаў вайны! Узмацняйце барацьбу за спыненне гонкі ўзбраенняў, забарону ядзернай зброі, усеагульнае і поўнае раззбраенне, за мір ва ўсім свеце!

10. Народы свету! Змагайцеся за спыненне Злучанымі Штатамі Амерыкі агрэсіўнай вайны супраць в'етнамскага народа, рашуча патрабуйце неадкладнага вываду амерыканскіх войск з Паўднёвага В'етнама!

Няхай шырыцца і мацнее міжнародная салідарнасць з гераічным в'етнамскім народам!

11. Народы Еўропы! Змагайцеся за ажыццяўленне эфектыўных мер па ўмацаванню міру і бяспекі ў Еўропе!

12. Народы свету! Змагайцеся супраць імперыялістычных планаў стварэння шматбаковых ядзерных сіл НАТО, супраць допуску заходнегерманскіх рэваншыстаў да ядзернай зброі! Дабівайцеся вырашэння германскага пытання на міралюбівай, сапраўды дэмакратычнай аснове!

13. Няхай жыве сусветная сацыялістычная сістэма — галоўная заваёва міжнароднага рабочага класа і ўсіх працоўных!

Няхай мацнее згуртаванасць, брацкая дружба і адзінства народаў усіх краін сацыялізма!

14. Брацкае прывітанне працоўным Народнай Рэспублікі Балгарыі, якія будуюць сацыялізм! Няхай жыве вечная, непарушная дружба і супрацоўніцтва паміж савецкім і балгарскім народамі!

15. Брацкае прывітанне працоўным Венгерскай Народнай Рэспублікі, якія будуюць сацыялізм! Няхай жыве вечная, непарушная дружба і супрацоўніцтва паміж савецкім і венгерскім народамі.

16. Брацкае прывітанне працоўным Дэмакратычнай Рэспублікі В'етнам, якія будуюць сацыялізм, змагаюцца супраць амерыканскіх агрэсараў за свабоду, незалежнасць і адзінства сваёй радзімы! Няхай жыве вечная, непарушная дружба і супрацоўніцтва паміж савецкім і в'етнамскім народамі!

17. Брацкае прывітанне працоўным Германскай Дэмакратычнай Рэспублікі, якія будуюць сацыялізм! Няхай жыве вечная, непарушная дружба і супрацоўніцтва паміж народамі Савецкага Саюза і ГДР!

18. Брацкае прывітанне працоўным Кітайскай Народнай Рэспублікі, якія будуюць сацыялізм! За дружбу і супрацоўніцтва паміж савецкім і кітайскім народамі!

19. Брацкае прывітанне працоўным Карэйскай Народна-Дэмакратычнай Рэспублікі, якія будуюць сацыялізм, змагаюцца за мірнае аб'яднанне сваёй краіны на дэмакратычных асновах! Няхай жыве вечная, непарушная дружба і супрацоўніцтва паміж савецкім і карэйскім народамі!

20. Брацкае прывітанне гераічнаму народу рэспублікі Куба, які будуе сацыялізм! Няхай жыве вечная, непарушная дружба і супрацоўніцтва паміж савецкім і кубінскім народамі!

21. Брацкае прывітанне працоўным Мангольскай Народнай Рэспублікі, якія будуюць сацыялізм! Няхай жыве вечная, непарушная дружба і супрацоўніцтва паміж савецкім і мангольскім народамі!

22. Брацкае прывітанне працоўным Польскай Народнай Рэспублікі, якія будуюць сацыялізм! Няхай жыве вечная, непарушная дружба і супрацоўніцтва паміж савецкім і польскім народамі!

23. Брацкае прывітанне працоўным Сацыялістычнай Рэспублікі Румыніі, якія будуюць сацыялізм! Няхай жыве вечная, непарушная дружба і супрацоўніцтва паміж савецкім і румынскім народамі!

24. Брацкае прывітанне працоўным Чэхаславацкай Сацыялістычнай Рэспублікі, якія будуюць сацыялізм! Няхай жыве вечная, непарушная дружба і супрацоўніцтва паміж савецкім і чэхаславацкім народамі!

25. Брацкае прывітанне працоўным Сацыялістычнай Федэратыўнай Рэспублікі Югаславіі, якія будуюць сацыялізм! Няхай жыве вечная, непарушная дружба і супрацоўніцтва паміж народамі Савецкага Саюза і Югаславіі!

26. Брацкае прывітанне працоўным Народнай Рэспублікі Албаніі, якія будуюць сацыялізм! За дружбу і супрацоўніцтва паміж савецкім і албанскім народамі!

27. Гарачае прывітанне народу Аб'яднанай Арабскай Рэспублікі, які будуе незалежную, нацыянальную, дэмакратычную дзяржаву, змагаецца за сацыялістычны шлях развіцця сваёй краіны! Няхай развіваецца і мацнее дружба і супрацоўніцтва паміж народамі Савецкага Саюза і Аб'яднанай Арабскай Рэспублікі!

28. Гарачае прывітанне народу Алжыра, які будуе незалежную, нацыянальную, дэмакратычную дзяржаву, змагаецца за сацыяльны прагрэс сваёй краіны! Няхай развіваецца і мацнее дружба і супрацоўніцтва паміж народамі Савецкага Саюза і Алжырскай Народнай Дэмакратычнай Рэспублікі!

29. Гарачае прывітанне народу Сірыйскай Арабскай Рэспублікі, які будуе незалежную, нацыянальную, дэмакратычную дзяржаву, змагаецца за сацыяльны прагрэс сваёй краіны! Няхай развіваецца і мацнее дружба і супрацоўніцтва паміж народамі Савецкага Саюза і Сірыйскай Арабскай Рэспублікі!

30. Гарачае прывітанне народам Бірмы, якія змагаюцца за незалежную, дэмакратычную дзяржаву, за сацыяльны прагрэс сваёй краіны! Няхай развіваецца і мацнее дружба і супрацоўніцтва паміж народамі Савецкага Саюза і Бірмы!

31. Гарачае прывітанне народам Гвінеі, Конга (Бразавіль) і Малі, якія будуюць незалежныя, нацыянальныя, дэмакратычныя дзяржавы, змагаюцца за сацыяльны прагрэс сваіх краін! Няхай развіваецца і мацнее дружба і супрацоўніцтва паміж народамі Савецкага Саюза і народамі Гвінеі, Конга і Малі!

32. Гарачае прывітанне вялікаму індыйскаму народу! Няхай развіваецца і мацнее дружба і супрацоўніцтва паміж народамі Савецкага Саюза і Індыі!

33. Гарачае прывітанне пакістанскаму народу! Няхай развіваюцца і мацнеюць сяброўскія, добрасуседскія адносіны паміж Пакістанам і Савецкім Саюзам!

34. Гарачае прывітанне інданезійскаму народу! Няхай развіваецца і мацнее дружба і супрацоўніцтва паміж народамі Савецкага Саюза і Інданезіі!

35. Гарачае прывітанне мужнаму народу Паўднёвага В'етнама, які вядзе гераічную барацьбу супраць узброенай інтэрвенцыі амерыканскага імперыялізму і прадажнага антынароднага рэжыму, за свабоду, незалежнасць і адзінства сваёй радзімы!

36. Гарачае прывітанне народам Камбоджы, Лаоса, Непала і Цэйлона, якія змагаюцца за мір і ўмацаванне нацыянальнай незалежнасці сваіх краін!

37. Гарачае прывітанне афганскаму народу! Няхай мацнеюць і развіваюцца сяброўскія, добрасуседскія адносіны паміж Савецкім Саюзам і Афганістанам!

38. Гарачае прывітанне мужнаму народу Паўднёвай Карэі, які змагаецца за вывад амерыканскіх войск, за мірнае уз'яднанне сваёй Радзімы!

39. Гарачае прывітанне народам арабскіх краін, якія змагаюцца за поўную ліквідацыю каланіялізму, умацаванне сваёй незалежнасці і сацыяльны прагрэс!

40. Гарачае прывітанне народам Паўднёвай Аравіі і Амана, якія вядуць справядлівую барацьбу супраць імперыялізму, за свабоду і незалежнасць!

41. Гарачае прывітанне народам афрыканскіх дзяржаў, якія змагаюцца супраць каланіялізму і імперыялізму, за ўмацаванне сваёй незалежнасці, за развіццё нацыянальнай эканомікі і культуры!

42. Гарачае прывітанне народам Анголы, Мазамбіка, «партугальскай» Гвінеі, Радэзіі і Паўднёвай Афрыкі, якія вядуць гераічную барацьбу супраць імперыялізму і расізму, за свабоду і незалежнасць!

43. Гарачае прывітанне народам Лацінскай Амерыкі, якія змагаюцца супраць імперыялізму, за поўную незалежнасць сваіх краін!

44. Сяброўскае прывітанне народу Францыі! Няхай мацнее і развіваецца традыцыйная дружба савецкага і французскага народаў у інтарэсах усеагульнага міру і еўрапейскай бяспекі!

45. Сяброўскае прывітанне народу Вялікабрытаніі! Няхай развіваецца і мацнее супрацоўніцтва паміж народамі Вялікабрытаніі і Савецкага Саюза ў барацьбе супраць ваеннай пагрозы, у інтарэсах мірнага развіцця Еўропы і забеспячэння міру ва ўсім свеце!

46. Сяброўскае прывітанне амерыканскаму народу! Няхай шырыцца супрацоўніцтва паміж народамі Злучаных Штатаў Амерыкі і Савецкага Саюза з мэтай прадухілення сусветнай вайны!

47. Няхай развіваюцца і мацнеюць дружалюбныя адносіны паміж савецкім народам і народамі Італіі і Грэцыі!

48. Няхай развіваюцца і мацнеюць добрасуседскія адносіны паміж савецкім народам і народамі Ірана і Турцыі!

49. Гарачае прывітанне працоўным і ўсім прагрэсіўным сілам Федэратыўнай Рэспублікі Германіі, якія змагаюцца супраць мілітарызму і адраджэння фашызму.

50. Гарачае прывітанне гераічнаму іспанскаму народу, які змагаецца за ліквідацыю фашысцкай дыктатуры і ўстанаўленне дэмакратычнага ладу!

51. Гарачае прывітанне народу Партугаліі, які вядзе мужную барацьбу за свабоду, супраць фашысцкага рэжыму!

52. Няхай жыве дружба і супрацоўніцтва паміж народамі Савецкага Саюза, Аўстрыі, Швецыі і Швейцарыі!

53. Гарачае прывітанне народу Фінляндыі! Няхай мацнеюць і развіваюцца сяброўскія, добрасуседскія адносіны паміж народамі Савецкага Саюза і Фінляндскай Рэспублікі!

54. Няхай развіваюцца і мацнеюць дружалюбныя адносіны паміж савецкім народам і народамі Бельгіі, Галандыі, Даніі, Ісландыі, Нарвегіі!

55. Гарачае прывітанне японскаму народу, які змагаецца за поўную незалежнасць сваёй краіны, супраць амерыканскіх ваенных баз, за забарону ядзернай зброі! Няхай развіваюцца і мацнеюць дружалюбныя адносіны паміж народамі Савецкага Саюза і Японіі!

56. Няхай жыве ленінская міралюбівая знешняя палітыка Савецкага Саюза!

57. Савецкія воіны! Свята захоўвайце і памнажайце гераічныя традыцыі Савецкай Арміі і Флоту, дабівайцеся новых поспехаў у баявой і палітычнай падрыхтоўцы, умацоўвайце воінскую дысцыпліну, будзьце заўсёды гатовы сакрушыць любога агрэсара!

Няхай жывуць авеяныя славай перамог доблесныя Савецкія Узброеныя Сілы!

58. Няхай мацнее і працвітае саюз рабочага класа і калгаснага сялянства — непарушная аснова Савецкай сацыялістычнай дзяржавы!

59. Няхай вечна жыве і працвітае непарушнае адзінства і брацкая дружба народаў СССР!

60. Слава ўдарнікам і калектывам камуністычнай працы! Слава перадавікам і наватарам вытворчасці!

61. Работнікі прамысловасці і транспарту! Змагайцеся за паспяховае ажыццяўленне рашэнняў XXIII з'езда КПСС, заданняў пяцігадовага плана па далейшаму развіццю прамысловасці і транспарту!

62. Работнікі прамысловасці, будаўніцтва і транспарту! Павышайце эфектыўнасць грамадскай вытворчасці, лепш выкарыстоўвайце капітальныя ўкладанні і асноўныя фонды, хутчэй асвойвайце новыя магутнасці!

63. Работнікі прамысловасці, будаўніцтва і транспарту! Умацоўвайце тэхналагічную і вытворчую дысцыпліну, развівайце гаспадарчы разлік, павышайце рэнтабельнасць вытворчасці!

(Заканчэнне на 2-й стар.).

ТЭАТР—ТРЫБУНА ВЯЛІКАЙ ДУМКІ

Пытанні драматургіі і рэпертуару тэатраў у сувязі з падрыхтоўкай да пяцідзесяцігоддзя Савецкай улады сталі тэмай гаворкі на нарадзе, скліканай Міністэрствам культуры і Саюзам пісьменнікаў БССР. У рабоце нарады прынялі ўдзел драматургі, дырэктары, галоўныя рэжысёры і вядучыя артысты тэатраў, крытыкі.

З дакладам выступіў міністр культуры БССР М. Мінковіч. У спрэчках прынялі ўдзел драматургі К. Губарэвіч, М.Гарулёў, І. Мележ, П. Васілеўскі, галоўны рэжысёр тэатра імя Янкі Купалы Б. Эрын, галоўны рэжысёр тэатра імя М. Горкага, заслужаны дзеяч мастацтваў РСФСР А. Даброцін, галоўны рэжысёр Брэсцкага тэатра імя Ленінскага камсамола Беларусі, заслужаны артыст БССР Г. Волкаў, галоўны рэжысёр Магілёўскага абласнога драматычнага тэатра, заслужаны дзеяч мастацтваў Марыйскай АССР Б. Валадарскі, дырэктар тэатра юнага гледача А. Вольскі, дырэктар Гродзенскага абласнога драматычнага тэатра І. Міхалюта, крытык Ул. Няфёд.

Друкуем справаздачу с нарады: на першай старонцы — скарочаны даклад М. Мінковіча, на чацвёртай—спрэчкі па дакладу.

З ДАКЛАДА МІНІСТРА КУЛЬТУРЫ М. МІНКОВІЧА

Наш народ рыхтуецца адзначыць гістарычную падзею — 50-годдзе Савецкай улады. Гэты факт мае не толькі ўнутрыдзяржаўнае, але і вялікае міжнароднае значэнне. Савецкая краіна не проста адзначае сваё нацыянальнае свята, яна дэманструе перад усім светам дасягненні і здабыткі сацыялістычнага грамадства. У чым перавагі сацыялізма перад капіталізмам? У чым незвычайная сіла і прывабнасць камуністычных ідэй? Што дае сацыялізм чалавецтву ў цэлым і кожнаму індывідууму паасобку? Якім стаў за пяцьдзесят гадоў наш чалавек, узняты рэвалюцыяй і выхаваны Савецкай уладай і Камуністычнай партыяй? Якія ў яго грамадскія і асабістыя ідэалы? Чаму ён стаў маяком, сімвалам надзей для працоўных усяго свету? На гэтыя пытанні хоча атрымаць ад нас адказ усё чалавецтва.

Паказаць савецкага чалавека ва ўсім яго характве і прыгажосці закліканы нашы работнікі літаратуры і мастацтва.

Мы часта прыпыкаем і да сваіх поспехаў і, на жаль, да некаторых сваіх недахопаў. Таму вельмі карысна бывае зірнуць на сябе збоку, тады і поспехі і хібы будуць відны больш выразна і акрэслена.

Сёлета прайшлі Фестываль беларускага мастацтва ў Расіі і Дэкада беларускага мастацтва і літаратуры ва Узбекістане. Прайшлі яны, трэба сказаць, з выключным поспехам, як хвалюючае, радаснае свята дружбы народаў-братоў. Нашых пісьменнікаў, мастацкія калектывы і выканаўцаў усюды прымалі надзвычай цёпла і сардэчна. Наша літаратура і мастацтва выклікала і ў Расіі і ва Узбекістане вялікую цікавасць да сябе, да беларускай культуры, да беларускага народа.

У Расіі і ва Узбекістане мы нібы ўбачылі сябе збоку і яшчэ раз пераканаліся, што беларускія пісьменнікі і работнікі мастацтва—велізарная сіла, якой пад сілу любыя самыя складаныя творчыя задачы. Мы пераканаліся, што сумеснымі намаганнямі пісьменнікаў і работнікаў мастацтва многае зроблена і яшчэ больш можна зрабіць.

Сапраўды, таварышы, сумеснымі намаганнямі можна дасягнуць многага. Але ж поспехі і абавязваюць нас. Давайце ж паспрабуем сумесна разабрацца, што адбываецца ў беларускім тэатральным мастацтве, у беларускай драматургіі.

Я хацеў бы спачатку коратка спыніцца на некаторых выніках мінулага тэатральнага сезона. Пачаць давядзецца з канстатацыі не вельмі вясёлага факта: за ўвесь сезон буйных творчых удач, звязаных з імёнамі беларускіх драматургаў, амаль не было.

Што перш за ўсё кідаецца ў вочы, калі робіш беглы агляд беларускай драматургіі за апошні час? Гэта—вельмі малая колькасць твораў. Нават у самы «ўраджайны» год мы маем не больш шасці-сямі п'ес. Як кажуць, ніжэй усякага мінімуму.

Для параўнання хачу спаслацца на прыбалтыйскія рэспублікі. У 1965 годзе ў Латвіі, як нам паведамілі, было напісана 25 п'ес, з іх пастаўлена 11. У Літве за мінулы год пастаўлена 8 арыгінальных п'ес, а напісана ў два разы больш. У Эстоніі летась было пастаўлена 10 сваіх п'ес, не лічачы інсцэніровак.

У мастацтве, вядома, колькасць вырашае яшчэ далёка не ўсё. Можна паставіць дзесяць п'ес, і праз паўгода пра іх ніхто не ўспомніць. А можна і адну, што будзе жыць дзесяцігоддзі і хваляваць нас, як хвалююць «Паўлінка», «Хто смяецца апошнім», «Брэсцкая крэпасць», «Канстанцін Заслонаў». Нездарма тэатр імя Янкі Купалы вырашыў яшчэ раз вярнуцца да «Канстанціна Заслонава», паставіць яго ў новай рэдакцыі.

Трэба адзначыць, што шэраг добрых твораў з'явіўся на сцэне нашых тэатраў і ў апошнія два-тры гады. Аднак большасць удач звязана не з пастаноўкай арыгінальных п'ес, а з інсцэніроўкай празаічных твораў. Мы, праўда, рады і гэтаму.

Значны поспех прынесла, у прыватнасці, тэатру імя Янкі Купалы інсцэніроўка рамана І. Мележа «Людзі на балоце». Гэта адзін з лепшых спектакляў сезона. Нягледзячы на асобныя хібы інсцэніроўкі, створаныя З. Браварскай і Т. Абакумоўскай, твор глыбока хвалюе. Ён вабіць сакавітымі, па-мастацку выразнымі характарамі, праўдзівым расказам аб жыцці беларускай вёскі. У нашым тэатральным мастацтве з'явіўся твор, блізкі па мастацкаму гучанню да такіх, як, скажам, «Узнятая цаліна» М. Шолахава.

Поспех тэатрам прынесла таксама пастаноўка п'есы «Сэрца на далоні» І. Шамякіна і Ю. Арынянскага па матывах аднайменнага рамана. У інсцэніроўцы (таксама як і ў рамане) вабяць вобразы нашых сучаснікаў—Яраша і Шыковіча, Тарасава і Зосі, вабіць гуманістычны пафас твора, барацьба герояў за справядлівасць, за перамогу ленінскіх норм жыцця.

Невыпадковая і цікавасць тэатраў да твора. Нягледзячы на страты і хібы, немінучыя пры пераўтварэнні празаічнага твора ў драматургічны, п'еса прыцягнула ўвагу амаль усіх тэатраў рэспублікі.

Мы не можам не адзначыць і поспеху маладога пісьменніка Анатоля Дзялендзіка. Яго п'еса «Выклік багам» ідзе ў многіх тэатрах рэспублікі. П'еса надрукавана ў часопісе «Тэатр» разам з лепшымі творамі іншых маладых драматургаў краіны.

На вялікі жаль, і тэматыка, і праблематыка, і ідэйна-мастацкі ўзровень многіх беларускіх п'ес пакідае жадаць лепшага.

Калі чытаеш беларускія п'есы апошняга часу, міжволі кідаецца ў вочы адна акалічнасць: некаторыя з іх тучаць празмерна камерна. У нас мала п'ес маштабных, у якіх узнімаліся б важныя сацыяльныя праблемы, карэнныя пытанні жыцця нашага грамадства, героі якіх сталі б упоравень з Трубнікавым, Бахіравым, Карчагіным.

На сцэне мы бачым часта толькі бледныя цені нашых сучаснікаў. П'есы і спектаклі захліставе драбнатэм'е, за герояў у іх выдаюцца людзі, якія ледзь-ледзь не паміраюць ад непадзеленага кахання, страшэнна пакутуюць над нейкімі праблемкамі, даўно ўжо вырашанымі жыццём. Вядома, такія творы не хвалююць, не кранаюць душу гледача.

Нярэдка бывае і так, што драматург бярэ жыццёва важную тэму, але не спраўляецца з ёю як мастак, не стварае пераканаўчых у мастацкіх адносінах вобразаў, не распрацоўвае глыбока канфлікту, і ад першапачатковай аўтарскай задумы нічога не застаецца. Глядач у такім выпадку не ўспрымае ідэі, бо перад ім не высокамастацкі твор, а плоская, сумная схема.

Як прыклад можна прывесці п'есу Р. Раманава «Я так хачу». Галоўным недахопам яе, на наш погляд, з'яўляецца неакрэсленасць пазіцыі асноўных герояў, неакрэсленасць аўтарскай пазіцыі. І хоць п'еса называецца «Я так хачу», вельмі цяжка зразумець, чаго ж усё-такі хочуць, чаго дабіваюцца яе героі. З прычыны аморфнасці, адсутнасці напружанага канфлікту траціцца цікавасць да п'есы ў цэлым.

Не хапіла майстэрства пісьменніку В. Зубу, каб стварыць яркі сцэнічны вобраз Марата Казея. П'еса пратрымалася ў рэпертуары тэатра юнага гледача, бадай, толькі з-за цікавасці моладзі да асобы героя Вялікай Айчыннай вайны. Нельга лічыць завершанай п'есу Я. Тарасава «Гэта было ў Магілёве», якая ў многім ілюстрацыйна, павярхоўна паказвае барацьбу магілёўскіх падпольшчыкаў у час вайны.

Вы спытаеце, а чаму ўсё-такі слабыя творы з'яўляюцца на сцэне?

Таму, што пры нашым рэпертуарным голадзе тэатры не вельмі пераборлівыя. І ў гэтым наша яшчэ адна вялікая бяда. Няма магчымасцей для выбару, а без такога выбару нельга гаварыць і пра фарміраванне высокамастацкага рэпертуару.

Адчуваючы надзвычай вострую патрэбу ў арыгінальных п'есах для тэатраў, Міністэрства культуры ўсяляк заахвочвае інсцэніраванне лепшых твораў сучаснай беларускай прозы. Першыя поспехі радуюць нас. Цяпер мы шукаем аўтараў, каб стварыць п'есы на аснове жамчужын беларускай паэзіі—паэм «Новая зямля» і «Сцяг брыгады». Мы вельмі хацелі б, каб сярод пісьменнікаў знайшоўся чалавек, які б узяўся напісаць лібрэта вясёлай музычнай камедыі на аснове бессмяротнай купалаўскай «Паўлінкі». Мы шукаем і аўтара, які б узяўся напісаць вялікую сцэнічную кампазіцыю пра народнага песняра Беларусі Якуба Коласа з выкарыстаннем яго твораў і твораў пра яго.

Гэта ўсё, што датычыць інсцэніравання і выкарыстання «нетэатральных» жанраў літаратуры. Шмат чаго чакаем мы і ад конкурсу на лепшую п'есу, прысвечаную пяцідзесяцігоддзю Савецкай улады. Конкурс, як вядома, працягнуты да 1 снежня 1966 года. Паступіла ўжо адзінаццаць п'ес. Будзем спадзявацца, што самыя лепшыя яшчэ паступяць.

Міністэрства культуры з мэтай кваліфікаванай дапамогі маладым драматургам будзе рэгулярна праводзіць творчыя семінары. На гэтыя семінары мы запросім вопытных кансультантаў з Масквы, Ленінграда, лепшых сваіх спецыялістаў. Першы такі семінар правядзём яшчэ сёлета.

Значная работа вядзецца з драматургамі нашай рэпертуарна-рэдакцыйнай калегіяй, самімі тэатрамі. Можна прывесці прыклад з Магілёўскім тэатрам. Не так даўно тут паставілі спектакль па п'есе мясцовага журналіста Я. Тарасава, а цяпер працуюць над п'есамі «Мурын бор» І. Ісачанкі і «Выхавай сына» Л. Караічава. Перад гэтым у тэатры быў пастаўлены спектакль «Сэрца на далоні».

Не ва ўсіх, аднак, тэатрах мясцовых драматургаў прымаюць з распасцёртымі абдымкамі. Іншы раз, чаго грахі таіць, аўтара сустракаюць не вельмі ветліва, асабліва, калі ён яшчэ не славуты, калі ён прынёс у тэатр сваю першую, можа, і недасканалую рэч. А якраз такі аўтар патрабуе вельмі пільнай увагі. І рэжысёры, каб не абцяжарваць сябе лішнімі клопатамі, пускаюцца на розныя дыпламатычныя хітрыкі, каб толькі як-небудзь адкараскацца ад такога чалавека.

Прывяду такі факт. Т. Абакумоўская і З. Браварская прынеслі першы варыянт інсцэніроўкі рамана І. Мележа «Людзі на балоце» ў тэатр імя Я. Купалы. Там не праявілі ніякай цікавасці да ініцыятывы аўтараў. Міністэрства культуры вымушана было перадаць інсцэніроўку ў тэатр імя Я. Коласа. І толькі пасля таго, як коласаўцы, шмат папрацаваўшы, давялі твор да ладу, у тэатры Я. Купалы згадзіліся прыняць інсцэніроўку. А цяпер мы бачым, якога поспеху дасягнуў тэатр, паставіўшы твор.

Іншы раз пагарда да нацыянальнай драматургіі выяўляецца ў тым, што беларускую п'есу ставіць найменш вопытны рэжысёр. Так, п'есу М. Гарулёва «Мая дачка» ў Гомельскім тэатры ставіла дыпламантка інстытута. Безумоўна, спектакль быў бы лепшы, калі б яго рыхтаваў вопытны пастаноўшчык. П'есу А. Дзялендзіка «Чатыры крыжы на сонцы» ў Віцебску і Брэсце паставілі таксама нявопытныя рэжысёры. Даручылі яе спачатку маладому рэжысёру і ў тэатры імя Я. Купалы, і толькі потым у работу ўключыўся галоўны рэжысёр Б. Эрын, што дало свае вынікі. Думаю, што і спектакль па п'есе Р. Раманава «Я так хачу» атрымаўся б значна лепшы, калі б яго ставіў, скажам, сам Б. Эрын.

Якія перспектывы чакаюць нас заўтра?

Я—аптыміст і спадзяюся, што Міністэрству культуры і Саюзу пісьменнікаў агульнымі намаганнямі ўдасца ўнесці ажыўленне ў творчасць нашых драматургаў і мабілізаваць пад тэатральныя сцэны новых творцаў. У нас ёсць звесткі і афіцыйныя (у выглядзе заявак і дагавораў), і неафіцыйныя, што пішуць новыя п'есы І. Шамякін, П. Васілеўскі, П. Харкоў, Р. Раманаў, Б. Сачанка, Ул. Дамашэвіч, А. Дзялендзік і некаторыя іншыя. Толькі нядаўна закончылі работу над новымі п'есамі А. Маўзон (п'еса пастаўлена ўжо ў тэатры імя Я. Коласа), М. Гарулёў (п'еса прынята Гродзенскім тэатрам), К. Губарэвіч (п'еса здадзена міністэрству), Ул. Мехаў (аўтар працуе сумесна з тэатрам юнага гледача), А. Гутковіч і Ф. Казоўская (п'еса прынята Брэсцкім тэатрам).

Але ўсё гэта толькі невялікая частка таго, што нам трэба зрабіць да 50-годдзя Савецкай улады. Нават калі ў нас з'явяцца тры дзесяткі выдатных беларускіх п'ес, і то будзе мала. Па тры п'есы на кожны тэатр—хіба гэта многа? Нам патрэбны многія дзесяткі п'ес, розных па жанрах, па тэматыцы, але не па якасці. Па якасці яны павінны быць аднолькавыя—добрыя.

Раней чуліся такія скаргі: вы, маўляў, аддаяце перавагу п'есам на сучасную тэму: а што мне рабіць, калі я хачу напісаць п'есу на гістарычную тэму, на ваенную тэму? Калі ласка, таварышы! Рэпертуарна-рэдакцыйная калегія сумесна з секцыяй па драматургіі Саюза пісьменнікаў склала вялікі план, у якім прадугледжаны розныя тэмы. Мы вельмі хацелі б, напрыклад, мець п'есы аб Кастрычніцкай рэвалюцыі і грамадзянскай вайне ў Беларусі, аб такіх дзеячах, як Фрунзе, Мяснікоў. Мы лічылі б найвялікшым здабыткам нацыянальнай драматургіі, калі б у нас з'явілася некалькі п'ес з вобразам Уладзіміра Ільіча Леніна.

Наша рэспубліка лічыцца ва ўсім свеце краем класічнага партызанскага руху. Паглядзіце, колькі ў нас герояў-партызан і падпольшчыкаў! Обальскія, скідзельскія, жлобінскія, магілёўскія, гомельскія, мінскія падпольшчыкі... А хіба ёсць у нас хоць адна п'еса, вартая гэтых герояў?

Нам трэба звярнуць асабліва ўвагу на выхаванне моладзі. П'есы пра моладзь у гады Вялікай Айчыннай вайны, пра сучасную моладзь, пра яе працоўныя будні, справы, інтарэсы, імкненні набываюць выключна важнае значэнне.

Драматургі часам вышукваюць мудрагелістыя сюжэтныя хады для сваіх п'ес. А гісторыя кожнага партызанскага атрада, кожнай падпольнай групы дае ў дзесяткі разоў больш цікавыя і жыццёва праўдзівыя сітуацыі, толькі трэба дакрануцца да гэтых гісторый талентам драматурга, па-мастацку асэнсаваць.

Сённяшні дзень, гераічная, стваральная праца савецкіх людзей дае ў рукі драматурга не менш багаты матэрыял. Наш сучаснік — чалавек цікавага лёсу, са складаным унутраным светам, чулы, сардэчны, патрабавальны— усё больш настойліва стукаецца ў дзверы пісьменніцкіх кабінетаў.

Сумесна, як я ўжо казаў, работнікі літаратуры і мастацтва могуць зрабіць многае. Драматургі і тэатры могуць адным словам прымусіць засмяяцца або заплакаць тысячы людзей адразу, яны могуць прымусіць людзей радавацца або гневацца, могуць узняць настрой, натхніць чалавека, зрабіць яго дужым, моцным, прыгожым душой. Мы павінны стварыць такія творы мастацтва, якія былі б варты нашага цудоўнага сучасніка, нашай Радзімы, нашай эпохі.

ПЕСНІ ТРЫМАЮЦЬ ЭКЗАМЕН

Маскоўскі тэатр эстрады. Тут ідзе конкурснае праслухоўванне лепшых выканаўцаў савецкай песні. Задача конкурсу — выявіць не толькі найбольш здольных артыстаў, але і папоўніць іх рэпертуар. У сталіцу прыехалі 80 салістаў і дванаццаць ансамбляў з усіх канцоў краіны. Кожны з удзельнікаў спаборніцтва выконвае тры сучасныя песні. Адна з іх абавязкова павінна быць новая.

Закончыўся першы этап конкурсу. Член журы народная артыстка РСФСР і заслужаная артыстка БССР Ірма Яунзем расказала карэспандэнту «Літаратуры і мастацтва»:

— У першым туры ўдала выступіла маладая беларуская спявачка Нінель Багуслаўская — салістка Беларускай дзяржаўнай філармоніі. Яна выканала новую песню Яўгена Глебава «Дом». У праграме спявачкі таксама «Песня нашых бацькоў» Д. Смольскага і «У полі бярозка стаяла» Ш. Абрамідзе. Мне спадабаўся і другі беларускі спявак — Віктар Вуяціч, саліст ансамбля песні і танца Беларускай ваеннай акругі. Са старшынёй журы народным артыстам СССР Леанідам Уцёсавым мы сышліся думкамі: голас у Вуяціча свежы, спявак трымаецца вельмі артыстычна. Вуяціч пазнаёміў нас з новай песняй І. Лучанка «Памяць сэрца». Добра прагучалі ў яго выкананні таксама «Салдат заўжды салдат» В. Салаўёва-Сядога і «Забойцы ходзяць па зямлі» Э. Калманоўскага.

Мы, старэйшыя майстры мастацтва, чакаем ад конкурсу многага. Ён павінен выявіць, якія песні стануць папулярнымі ў год юбілею Савецкай улады, паказаць, якія ў эстрады рэзервы. Да апошняга, трэцяга туру, па ўмовах конкурсу, дапускаюцца восем салістаў і пяць ансамбляў. Будзем спадзявацца, што сярод іх будуць і прадстаўнікі Беларусі.

□ □ □

Газета ўжо вярсталася, калі з Масквы паведамілі аб першых выніках конкурсу.

З 80 салістаў да другога туру дапушчаны 27. Абодва беларускія выканаўцы трапілі ў іх лік.

Учора ў Мінску у Дзяржаўным мастацкім музеі адкрылася Рэспубліканская выстаўка маладых мастакоў

ЗАКЛІКІ ЦК КПСС

ДА 49-Й ГАДАВІНЫ ВЯЛІКАЙ КАСТРЫЧНІЦКАЙ САЦЫЯЛІСТЫЧНАЙ РЭВАЛЮЦЫІ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.).

64. Працоўныя Савецкага Саюза! Павышайце прадукцыйнасць працы, зніжайце сабекошт, змагайцеся за паляпшэнне якасці прадукцыі!

65. Працоўныя Савецкага Саюза! Дабівайцеся эканомнага выдаткавання матэрыяльных рэсурсаў і дзяржаўных сродкаў! Змагайцеся з безгаспадарчасцю, празмернасцямі і марнатраўствам!

66. Работнікі прамысловасці, будаўніцтва і транспарту! Ажыццяўляйце комплексную механізацыю і аўтаматызацыю, настойліва ўкараняйце ў вытворчасць дасягненні навукі, тэхнікі і перадавы вопыт! Шырэй выкарыстоўвайце метады навуковай арганізацыі працы!

67. Савецкія металургі і гарнякі! Павялічвайце здабычу руды, вытворчасць чыгуну, сталі, пракату, труб, каляровых і рэдкіх металаў! Змагайцеся за комплекснае выкарыстанне сыравіны, расшырайце сартымент, паляпшайце якасць металу!

68. Савецкія энергетыкі, будаўнікі і мантажнікі электрастанцый і электрасетак! Хутчэй уводзьце магутнасці на электрастанцыях і новыя лініі электрапередач, зніжайце кошт будаўніцтва і эксплуатацыі энергасістэм!

69. Работнікі машынабудавання і прыборабудавання! Аснашчайце народную гаспадарку найноўшымі, эканамічнымі і надзейнымі машынамі, прыборамі, сродкамі механізацыі і аўтаматызацыі!

70. Работнікі вугальнай прамысловасці! Павялічвайце здабычу вугалю, зніжайце яго сабекошт! Лепш выкарыстоўвайце горную тэхніку!

71. Работнікі нафтавай і газавай прамысловасці! Павялічвайце здабычу нафты і газу! Хутчэй асвойвайце новыя нафтавыя і газавыя месцанараджэнні!

72. Работнікі нафтаперапрацоўчай і нафтахімічнай прамысловасці! Змагайцеся за павелічэнне выпуску і павышэнне якасці прадуктаў нафты і нафтахіміі! Шырэй укараняйце новую тэхніку і прагрэсіўную тэхналогію вытворчасці!

73. Работнікі хімічнай прамысловасці! Змагайцеся за тэхнічны прагрэс, за павелічэнне выпуску і павышэнне якасці хімічных прадуктаў для вытворчасці тавараў народнага ўжытку! Больш мінеральных угнаенняў і сродкаў аховы раслін для сельскай гаспадаркі!

74. Савецкія геолагі! Хутчэй адкрывайце багацці нетраў нашай радзімы, павышайце эфектыўнасць геолагаразведачных работ!

75. Савецкія будаўнікі, работнікі прамысловасці будаўнічых матэрыялаў! Паспяхова выканаем намечаную XXIII з'ездам КПСС праграму будаўнічых работ у новай пяцігодцы!

76. Савецкія будаўнікі! Павышайце тэмпы, паляпшайце якасць і зніжайце кошт будаўніцтва! Хутчэй уводзьце ў дзеянне вытворчыя, жылыя, камунальныя і культурна-бытавыя аб'екты ў горадзе і ў вёсцы!

77. Работнікі лясной цэлюлозна-папяровай і дрэваапрацоўчай прамысловасці! Дадзім краіне больш драўніны, мэблі, цэлюлозы і паперы высокай якасці!

78. Работнікі лёгкай, харчовай, мяса-малочнай і мясцовай прамысловасці! Павялічвайце вытворчасць, паляпшайце асартымент, павышайце якасць тавараў народнага ўжытку!

79. Работнікі рыбнай прамысловасці! Павялічвайце ўлоў рыбы, паляпшайце якасць і зніжайце сабекошт рыбных прадуктаў!

80. Работнікі транспарту! Паўней задавальняйце патрэбнасці прамысловасці і сельскай гаспадаркі ў перавозках! Лепш абслугоўвайце пасажыраў! Скарачайце тэрміны дастаўкі грузаў, зніжайце сабекошт перавозак!

81. Работнікі сувязі! Развівайце і ўдасканальвайце сродкі сувязі! Паляпшайце абслугоўванне насельніцтва!

82. Гонар і слава працаўнікам сельскай гаспадаркі, якія паспяхова выконваюць і перавыконваюць планы вытворчасці і продажу дзяржаве прадуктаў земляробства і жывёлагадоўлі!

83. Калгаснікі і работнікі саўгасаў, спецыялісты сельскай гаспадаркі! Змагайцеся за выкананне рашэнняў XXIII з'езда КПСС і пленумаў ЦК! Павышайце ўраджайнасць сельскагаспадарчых культур і прадуктыўнасць жывёлагадоўлі! Укараняйце ў вытворчасць дасягненні навукі, тэхнікі і перадавы вопыт, дабівайцеся рэнтабельнасці кожнага калгаса і саўгаса!

84. Работнікі сельскай і воднай гаспадаркі! Змагайцеся за высокую культуру земляробства, ажыццяўляйце шырокую праграму меліярацыі зямель, павышайце ўрадлівасць глеб, дабівайцеся высокага ўраджаю з кожнага гектара зямлі!

85. Механізатары калгасаў і саўгасаў! Змагайцеся за ўздым сельскагаспадарчай вытворчасці! Лепш вывучайце, прадукцыйна выкарыстоўвайце і беражыце тэхніку!

86. Работнікі дзяржаўнага і кааператыўнага гандлю! Удасканальвайце гандаль і грамадскае харчаванне, лепш абслугоўвайце насельніцтва!

87. Работнікі службы быту! Усямерна паляпшайце абслугоўванне савецкіх людзей, паўней задавальняйце іх запатрабаванні!

88. Работнікі савецкіх устаноў! Чула адносіцеся да патрэб і запатрабаванняў працоўных, выкараняйце бюракратызм і цераніну!

89. Работнікі і актывісты народнага кантролю! Шырэй уцягвайце працоўных у справу кантролю !Змагайцеся за ўмацаванне дзяржаўнай дысцыпліны, за эканомію і беражлівасць у народнай гаспадарцы!

90. Работнікі навукі і вышэйшых навучальных устаноў! Змагайцеся за далейшы росквіт навукі, за тэхнічны прагрэс! Умацоўвайце сувязі навукі з вытворчасцю! Рыхтуйце спецыялістаў, вартых эпохі камунізма!

91. Слава савецкім вучоным, канструктарам, інжынерам, тэхнікам і рабочым, якія адкрылі новыя гарызонты ў асваенні касмічнай прасторы!

Слава доблесным савецкім касманаўтам!

92. Работнікі культуры! Змагайцеся за выкананне рашэнняў XXIII з'езда КПСС па далейшаму развіццю сацыялістычнай культуры, расшырэнню і ўмацаванню яе матэрыяльнай базы! Усямерна паляпшайце культурнае абслугоўванне савецкіх людзей!

93. Дзеячы літаратуры і мастацтва! Змагайцеся за партыйнасць і народнасць, высокую ідэйнасць і мастацкае майстэрства твораў! Ярчэй адлюстроўвайце веліч і прыгажосць гераічных спраў савецкага народа, яго палымяны патрыятызм, барацьбу за перамогу камуністычных ідэалаў!

94. Работнікі асветы! Удасканальвайце народную адукацыю, выхоўвайце ў падрастаючага пакалення працавітасць, калектывізм, адданасць справе камунізма!

95. Медыцынскія работнікі! Змагайцеся за здароўе савецкага чалавека! Укараняйце ў практыку найноўшыя дасягненні медыцынскай навукі!

96. Няхай жыве наша сацыялістычная дзяржава! Няхай развіваецца і мацнее савецкая дэмакратыя, расце актыўнасць працоўных у кіраванні справамі краіны!

97. Няхай жывуць савецкія прафсаюзы — школа камунізма!

98. Няхай жывуць савецкія жанчыны — актыўныя будаўнікі камуністычнага грамадства!

Слава жанчыне-маці, выхавальніцы дзяцей, нястомнай працаўніцы на вытворчасці і ў быце!

99. Ветэраны рэвалюцыі, працы і вайны! Больш актыўна ўдзельнічайце ў грамадска-палітычным жыцці краіны, у выхаванні моладзі на рэвалюцыйных, баявых і працоўных традыцыях савецкага народа!

100. Няхай жыве ленінскі камсамол — верны памочнік і рэзерв Камуністычнай партыі!

101. Юнакі і дзяўчаты! Настойліва авалодвайце ведамі, вучыцеся працаваць і жыць па-камуністычнаму!

Няхай жыве слаўная савецкая моладзь!

102. Піянеры і школьнікі! Добра вучыцеся, любіце і паважайце працу! Рыхтуйцеся стаць актыўнымі барацьбітамі за справу Леніна, за камунізм!

103. Камуністы! Будзьце ў авангардзе барацьбы за выкананне рашэнняў XXIII з'езда КПСС, за пабудову камунізма ў СССР!

104. Слава вялікаму савецкаму народу — доблеснаму будаўніку камунізма, мужнаму барацьбіту за свабоду, мір і шчасце ўсіх людзей на зямлі!

105. Няхай жыве вялікае непарушнае яднанне партыі і народа!

106. Няхай жыве Саюз Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік!

107. Няхай жыве наш родны Савецкі ўрад!

108. Няхай жыве створаная Леніным слаўная Камуністычная партыя Савецкага Саюза!

ЦЭНТРАЛЬНЫ КАМІТЭТ КАМУНІСТЫЧНАЙ ПАРТЫІ САВЕЦКАГА САЮЗА

ГОСЦІ З ВІЛЬНЮСА

Дружба бібліятэчных работнікаў Літвы і Беларусі працягваецца ўжо шмат гадоў. Літоўскія бібліятэкары не раз былі ў нашай рэспубліцы, мы таксама ездзілі знаёміцца з вопытам іх работы.

Гэтымі днямі група работнікаў Літоўскай рэспубліканскай бібліятэкі — усяго 22 чалавекі — наведала Дзяржаўную бібліятэку БССР імя Ул. І. Леніна. Яны цікавіліся работай аддзела беларускай літаратуры і бібліяграфіі, аддзела мастацтва, станам каталогаў і даведачна -бібліяграфічнага абслугоўвання чытачоў. Літоўскія сябры агледзелі шматлікія выданні бібліятэкі імя Ул. І. Леніна і атрымалі аўтографы.

Бібліятэкары з братняй рэспублікі пабывалі таксама ў Доме-музеі I з'езда РСДРП, у музеі Янкі Купалы, зрабілі экскурсію па гораду.

А. МЕЛАМЕД,
заг. навукова-метадычнага аддзела бібліятэказнаўства Дзяржаўнай бібліятэкі БССР імя Ул. І. Леніна.

СЛОВА ПРА ЦІКАВАГА ЧАЛАВЕКА

НАПІСАЦЬ пра чалавека нарыс... Не ведаю нічога больш цяжкага. Гэта ж трэба заўважыць і перадаць асаблівасці твайго героя, рысачкі яго характару. Каб паўстаў перад чытачом жывы чалавек... Але ж паспрабуй, дабіся такога. Каб чалавека пазнаць, трэба з ім, як кажуць, пуд солі з'есці. А колькі той солі з'ясі за час камандзіроўкі...

Вось ты сядзіш насупраць героя твайго будучага нарыса. А што яму расказаць табе? Ну, пра работу сваю яшчэ так-сяк. Тут лічбы, канкрэтныя факты. А пра сваё асабістае? Што ён табе раскажа пра сваё асабістае, табе, амаль незнаёмаму чалавеку, калі, бывае, не ўсё раскажаш і блізкаму сябру.

Пра ўсё гэта думаў я, едучы да Дзям'яна Раманавіча Новікава, па чутках чалавека славутага, чалавека незвычайнага. Сорак сем год узначальвае ён бібліятэку Беларускай сельскагаспадарчай акадэміі ў Горках. На ўсю рэспубліку славіцца як выдатны кветкавод, садавод.

Ну, а сам які ён чалавек? Кажуць, што аб чалавеку мяркуюць па яго справах. Але ж, мне здаецца, важна яшчэ і якой цаной гэтыя справы дасягнуты.

І вось, уяўляў я сабе, як прыеду зараз у Горкі, знайду Дзем'яна Раманавіча і пачну яго мучыць...

Але яму здорава пашанцавала. Дзям'яна Раманавіча я ў Горках не застаў — паехаў ён адпачываць на поўдзень.

Вось так. І застаўся карэспандэнт, як кажуць, з носам. Паварочвай аглоблі. І едзь без матэрыялу.

Відаць, не вельмі шчаслівы быў у мяне выгляд, бо ў акадэмічнай бібліятэцы (там працуе шмат людзей) мне з усіх бакоў пасыпаліся спачуванні. А адна з супрацоўніц (яна, дарэчы, замяшчае Дзям'яна Раманавіча) сказала:

— А навошта вам вяртацца без нічога? Пагаварыце з людзьмі, якія добра ведаюць Новікава, яны ж больш раскажуць пра яго, чым ён сам, бо наш Дзям'ян Раманавіч вельмі, вельмі сціплы чалавек.

І я падумаў: сапраўды, мы ж не тое, што самі пра сябе думаем, а тое, што пра нас думаюць людзі, сярод якіх жывём.

І пайшоў я па слядах, па сцежках Дзям'яна Раманавіча. Пайшоў я па людзях, што даўно яго ведаюць. Гэта было цікавейшае падарожжа па старонках вуснай кнігі аб Чалавеку.

Кожны, з кім я гаварыў, — сярод маіх субяседнікаў былі і выкладчыкі акадэміі, і студэнты, і бібліятэкары, і газетчыкі, і проста жыхары Горак,—расказваў пра такую рысачку Дзям'яна Раманавіча, якая, відаць, больш за ўсё імпанавала яму самому. І расказвалася ўсё гэта то спакойна, раздумліва, то з запальчывасцю і такой зацікаўленасцю, нібы справа ішла аб нечым вельмі важным для самога расказчыка.

— Гм, гм... значыць, цікавіцеся Дзям'янам Раманавічам? Вельмі паважаны калега. Эрудыт, скажу я вам, якіх мала. У розных галінах. Бібліёграфа такога не знайсці. Наша бібліятэка — ведаеце — трэцяя ў краіне сярод бібліятэк сельскагаспадарчых навучальных устаноў — 670 тысяч тамоў спецыяльнай і мастацкай літаратуры. Яго заслуга.

— Дзям'ян Раманавіч? Пра сябе ён думае заўсёды ў апошнюю чаргу. Ведаеце, што ён зрабіў, калі ў 1946 годзе дэмабілізаваўся і зноў прыехаў у акадэмію? За свае грошы адрамантаваў будынак бібліятэкі, потым за свае грошы ездзіў па краіне, збіраў кнігі. А нядаўна, ведаеце, што ён зрабіў? Не было стаўкі для аднаго бібліятэкара, дык ён узяў чалавека і плаціў яму са сваёй кішэні. А той і не ведаў...

— Прыйдзеш у бібліятэку і спытаеш якое-небудзь рэдкае выданне, а бібліятэкар, бывае, і не ведае, дзе яно стаіць. Шукае, шукае, а потым бяжыць у кабінет да Дзям'яна Раманавіча. А ён упэўненым крокам ідзе да паліцы і адразу дастае кнігу, нібы толькі што сам паставіў.

— І што за чалавек? Усё бягом, бягом. Бывае, раніцой спяшаемся мы на лекцыю, бачым, ледзь не бяжыць Дзям'ян Раманавіч па вуліцы — у сваю бібліятэку, значыць, быццам за ноч там што здарылася.

— Дзям'ян Раманавіч — грамадскі работнік. Сапраўдны дзеяч. Сем год ужо кіруе паркавай гаспадаркай акадэміі. На грамадскіх асновах. Дэпутат гарсавета. Таксама многа год. Ходзяць да яго людзі з усіх Горак. Па дапамогу, пачуць наша студэнцкая маладосць (божа, як усё гэта даўно было). І сваімі ведамі, і сваёй любоўю да прафесіі агранома, і сваімі марамі (а яны нараджаліся там, сярод кніжных паліц бібліятэкі) мы абавязаны вам...»

...З Галінай Пятроўнай мы выходзім у парк, хвалююча прыгожы нават сёння, у шэры кастрычніцкі дзень. Зямлі не відаць. Яна пад тоўстым покрывам апалага лісця— бурага, чырвонага, жоўтага... І старыя чорныя дрэвы — нібы ўвасабленне вечнага спакою і цішыні.

Мы выходзім на вялікую палянку. Моцна пахне прэлым лісцем і мокрай зямлёй. Пахне восенню. Уся палянка ў голых кустах.

— Эх, прыехалі б вы да нас летам, палюбаваліся б разарыем Дзям'яна Раманавіча,—шкадуе Галіна Пятроўна.—Прайшла пара кветак. А іх у нас столькі па ўсім гарадку... Адной вяргіні некалькі дзесяткаў гатункаў, столькі ж гладзіёлусаў і іншых кветак. Дзям'ян Раманавіч з усяго Саюза атрымлівае насенне, сам пасылае...

Потым мы заходзім у батанічны сад акадэміі. Тут каля 700 дрэў і мясцовай фауны, і прывезеных з далёкіх краёў. Жалезнае дрэва, туя, канадская сасна... Пад кожным табліччка.

— Дзям'ян Раманавіч гаворыць, што праз пару год тут будзе каля тысячы дрэў.

І тут Дзям'ян Раманавіч... Мяне ахоплівае нейкае дзіўнае пачуццё. Захапленне? Не, хаця і гэта ёсць. Удзячнасці? Мабыць. Во, знайшоў! Зайздрасці. Так, так зайздрасці. Не вельмі прыгожае пачуццё, але сёння я не саромеюся яго. Як жа не пазайздросціць чалавеку, які і ў адсутнасць сваю нагадвае пра сябе на кожным кроку, які заўсёды ў людской памяці, у людскіх сэрцах.

Перад тым, як ехаць з Горак, я прагледзеў кіпу фотакартак Дзям'яна Раманавіча. Са студэнтамі, з сябрамі, партрэты. Ледзь збянтэжаная ўсмешка, сур'ёзныя, шырока пастаўленыя вочы, гладка зачэсаныя сівыя валасы. Не, ён не выглядае на свае семдзесят год. Эге-ж, я ледзь не забыўся сказаць, што Дзям'яну Раманавічу сёння, 18 кастрычніка, спаўняецца семдзесят. Відаць, забыўся таму, што ўсё расказанае ніяк не стасуецца са старасцю.

Я не ведаю, што звычайна жадаюць чалавеку ў такія гады. Ведаю толькі, што сёння сябры і вучні Дзям'яна Раманавіча пажадаюць яму аднаго — вечнай маладосці, вечнага гарэння.

М. ЗАМСКІ.

г. Горкі.

У МАЙСТЭРНЯХ МАСТАКОЎ

ФАРБАМІ ЗВОНКІМІ, СОНЕЧНЫМІ

Дзмітрый Алейнік за работай.

Фота П. БЕЛАВУСА.

Мы ў майстэрні маладога гомельскага мастака Дзмітрыя Алейніка. Гэта не першае наша таварыскае наведанне. Мы былі тут і раней, і як таварышы заўсёды ўважліва прыглядаліся да таго, што робіць мастак, якія ён распрацоўвае сюжэты, шукае каляровыя спалучэнні.

— У апошні час, — гаворыць Д. Алейнік, — я больш займаюся пейзажам. Паездкі ў Карэлію, па Далёкай Поўначы, па Беларусі далі мне шмат цікавага матэрыялу.

Знаёмімся з новымі работамі аўтара. У яго, як нам здаецца, больш звонкімі сталі фарбы, вастрэйшая і больш выразная кампазіцыя. Мастак піша з любоўю каменне, парослае лішайнікам розных каляровых адценняў, тонкія стройныя елкі з ажурнымі галінкамі, сінеючыя ўдалечы лясы, ціхую роўнядзь азёр, помнікі старажытнага дойлідства. Мажорныя колеры ўзмацняюць эмацыянальнае гучанне пейзажаў.

У эцюдах «Скалы», «Вечар», «Апошнія промні», «Від на Ладагу з Валаамскага манастыра» мастак імкнецца да манументальнасці, абагуленасці формы. Адчуваецца, што яму палюбілася велічная і маляўнічая прырода паўночнага краю.

Гэта была не першая паездка на Поўнач. Разам з таварышамі Алейнік ездзіў туды і летась. І калі ў некаторых работах, выкананых у час першай паездкі, адчуваецца апрацоўка маленькім пэндзлем дэталей рэчаў («Кіжы», «Елі»), дык новыя эцюды, у якіх мастак спрабуе «браць» натуру з нейкай верхняй кропкі, выглядаюць больш спакойна і эпічна.

Мастак доўга і падрабязна расказваў нам пра свае ўражанні ад паездкі на Поўнач, але потым, абарваўшы гаворку, усміхаючыся, дадаў:

— Поўнач прыгожая, але наша Беларусь... Гэта мы яшчэ больш востра адчулі, як толькі зноў апынуліся на роднай зямлі.

Дзмітрый многа паездзіў па Гомельшчыне, пісаў эцюды. У бліжэйшы час ён збіраецца на Браслаўскія азёры. Ён ведае, што толькі ў штодзённым вывучэнні жыцця, у настойлівай і стараннай працы над сабою ляжыць шлях у вялікае мастацтва. Матэрыял, сабраны ў паездках, мастак будзе старанна апрацоўваць дома, адбіраць, удумліва пераасэнсоўваць. Мастак хоча, у прыватнасці, стварыць да 50-годдзя Савецкай улады вялікі тэматычны твор «Сяўба ў калгасе». Праўда, мастак скардзіцца: каб пісаць такія работы, патрэбна майстэрня, а яе ў Алейніка яшчэ няма...

Многія работы мастака сёння ўжо вядомы мастацкай грамадскасці. Гледачам палюбіліся яго светлыя аптымістычныя пейзажы. У рабоце «Вечная памяць» Д. Алейнік у простым і звычайным здолеў убачыць вялікае і гераічнае. Ясная кампазіцыя, цёплая залацістаранжавая гама фарбаў, шырокая манера пісьма — усё падпарадкавана ў гэтай карціне раскрыццю галоўнай думкі.

Сёння мастак увесь у пошуку. Ён шукае новыя кампазіцыйныя прыёмы, новыя спалучэнні колераў, імкнучыся выявіць прыгажосць, цэласнасць і гарманічнасць свету.

Творчы шлях мастака невялікі. Але дзякуючы нястомным пошукам, вялікай працавітасці, нястомнай энергіі, ён дасягнуў многага. Пра гэта пераканаўча гавораць яго пейзажы, партрэты, тэматычныя кампазіцыі. Мастака хвалююць праца людзей, прыгажосць роднай прыроды. І пра гэта ён спрабуе расказаць.

Р. ЛАНДАРСКІ,
А. ШНЫПАРКОЎ.

г. Гомель.

З Другой рэспубліканскай выстаўкі твораў маладых мастакоў. Л. ДУДАРЭНКА. Партрэт настаўніка Хаўжэнні.

СЕЗОН 1966-67 г.

ШАСТАКОВІЧУ ПРЫСВЯЧАЕЦЦА

Творы Дзмітрыя Шастаковіча даўно ўжо заваявалі на сімфанічных эстрадах свету прызнанне і папулярнасць. Асабліва шырока выконваліся творы выдатнага савецкага кампазітара ў дні, калі святкавалася яго шасцідзесяцігоддзе. Адгукнуўся на юбілей і Дзяржаўны сімфанічны аркестр БССР. Беларуская філармонія наладзіла цыкл юбілейных канцэртаў, на якіх аркестр пад кіраўніцтвам заслужанага артыста БССР Віталія Катаева ўжо выканаў Першую і Трынаццатую сімфоніі.

Першая сімфонія—дыпломная пры заканчэнні кампазітарскага факультэта Ленінградскай кансерваторыі — была напісана Шастаковічам у 1925 годзе і ўпершыню выканана сорак год назад, выклікаўшы буру захаплення. Маці кампазітара пісала на другі дзень пасля прэм'еры ў пісьме да сяброў: «Самы вялікі поспех выпаў на Міцеву долю. Пасля заканчэння сімфоніі Міцю выклікалі яшчэ і яшчэ. Калі наш юны кампазітар, які выглядаў зусім хлапчуком, з'явіўся на эстрадзе, бурнае захапленне публікі перайшло ў авацыю...». Хутка пасля ленінградскай прэм'еры Першая сімфонія прагучала ў Берліне, Філадэльфіі, Нью-Йорку. Так музычны свет даведаўся пра з'яўленне новага вялікага кампазітарскага таленту, так прыйшло да Шастаковіча ўжо ў ранні час яго творчасці сусветнае прызнанне.

Першая сімфонія паказала не толькі вялікі талент маладога кампазітара, але і яго ўпэўненае майстэрства, творчую фантазію. Ёсць у гэтай сімфоніі тое, што стала потым характэрным для многіх твораў Шастаковіча: тонкі гумар і вострая іронія, з аднаго боку, парасткі трагедыйнасці—з другога. Але асабліва ўражвае юнацкая свежасць бачання свету. Невыпадкова адзін зарубежны крытык, адчуўшы ў гэтай сімфоніі адлюстраванне савецкай рэчаіснасці, пісаў: «Гэта голас новага пакалення ў музыцы і жыцці».

Трынаццатая сімфонія (1962) напісана кампазітарам, узбагачаным вялікім жыццёвым і творчым вопытам. Шастаковіч — сапраўдны наватар, які старанна шукае і знаходзіць новае ў музычным мастацтве. Такая і гэта сімфонія-аратарыя для саліста-спевака, мужчынскага хору (басы) і сімфанічнага аркестра, у пяці частках якой выкарыстаны пяць вершаў Яўгенія Еўтушэнкі: «Бабін яр», «Гумар», «У магазіне», «Страхі» і «Кар'ера». Пяць розных вершаў набылі ў сімфоніі цэласнасць і адзінства, аб'яднаныя высокай грамадзянскай ідэяй. Сам Шастаковіч сказаў пра сваю Трынаццатую: «Грамадскія паводзіны чалавека-грамадзяніна— вось што заўсёды вабіла мяне, над гэтым я думаў. У Трынаццатай сімфоніі я паставіў праблему грамадзянскай, іменна грамадзянскай маралі». Гэтую праблему Шастаковіч вырашыў у творы высокіх мастацкіх вартасцей. Нельга не пагадзіцца з Марыэтай Шагінян, якая нядаўна пісала пра Трынаццатую сімфонію: «Гэта высокая песня пра чалавечую мужнасць, магутны заклік да грамадзянскай высакароднасці, да служэння вялікім ідэалам новага грамадства».

Нам помніцца прайшоўшая з вялікім поспехам пад кіраўніцтвам В. Катаева мінская прэм'ера Трынаццатай сімфоніі ў санаўніку 1963 года, на якую прыязджаў сам Шастаковіч. І вось новае выкананне гэтага выдатнага твора, якое стала кульмінацыяй юбілейных канцэртаў. Дырыжор здолеў і на гэты раз запаліць сваім энтузіязмам, сваёй улюбёнасцю ў Трынаццатую ўвесь выканаўчы калектыў (сімфанічны аркестр і зводны хор басоў пад кіраўніцтвам Віктара Роўды, саліст Аскольд Бяседзін).

Шмат добрага было ў ігры аркестра і спяванні хору. Адзначым, у прыватнасці, выдатнае выкананне цікавага сола трубы ў чацвёртай частцы артыстам аркестра Е. Мельнічуком і—асабліва—завяршаючы эпізод сімфоніі, які прагучаў вельмі тонка і паэтычна.

Менш удала, на жаль, была выканана дырыжорам і аркестрам Першая сімфонія. Перабольшаныя тэмпы і паспешлівасць у першых дзвюх частках прывялі да таго, што графічна строгі малюнак музычных думак страціў сваю выразнасць. Адсутнічала і такая неабходная ў гэтай празрыстай музыцы высокая сыгранасць.

У Першай сімфоніі шмат сольных эпізодаў, і гэта накладае на салістаў аркестра вялікую адказнасць. Добра прагучала ў артыста Г. Гедыльтэра сола флейты ў першай частцы. Але былі і недахопы. Так, напрыклад, літаўры, якім Шастаковіч даручыў у чацвёртай частцы адказнае сола, былі настроены недастаткова добра, і мелодыя не атрымалася.

Трэцім буйным творам Шастаковіча, які выконваўся ў юбілейных канцэртах, была паэма для баса, хору і сімфанічнага аркестра «Пакаранне смерцю Сцяпана Разіна», на вершы Еўтушэнкі. Напісаны пасля Трынаццатай сімфоніі, гэты твор працягвае лінію сімфанічна-харавой творчасці Шастаковіча. З ім мы пазнаёміліся ў дні Дэкады рускага мастацтва ў студзені 1965 года ў цудоўным выкананні маскоўскіх калектываў пад кіраўніцтвам К. Кандрашына. Затым было вельмі няўдалае выкананне «Пакарання» мінскімі калектывамі і дырыжорам С. Прохаравым. Цяпер Дзяржаўны сімфанічны аркестр БССР і Дзяржаўная акадэмічная харавая капэла БССР (мастацкі кіраўнік народны артыст СССР Рыгор Шырма) паказалі сябе з найлепшага боку. Відаць, стыль падобных сімфанічна-харавых твораў В. Катаеву як дырыжору вельмі блізкі. Паэма прагучала ярка і пераканаўча, яе драматычны размах і трагедыйная сутнасць былі ўвасоблены досыць глыбока. Аркестравыя эпізоды пакарання Сцяпана і «паганага пляса» зрабілі асабліва моцнае ўражанне.

Паспяхова выканаў сольную басовую партыю саліст філармоніі Сяргей Машкоў. Прыгожы голас, музычнасць, добрая дыкцыя, асэнсаванае, драматычна выразнае спяванне—усё гэта парадавала.

У дзвюх рэцэнзуемых праграмах былі прадстаўлены два канцэрты Шастаковіча—Першы фартэпіянны і Скрыпічны, выкананыя маскоўскімі гастралёрамі. Гэта творы рэзка кантрасныя, яны адносяцца да двух розных перыядаў творчасці кампазітара—пачатковага і сталага.

Першы фартэпіянны канцэрт (1933) у большай меры, чым Першая сімфонія, твор эксперыментальны, стылістычна няроўны і трошкі странаты. Аднак змяшанне стыляў, супастаўленне эпізодаў «сур'ёзнай» і «лёгкай» музыкі, тонкай лірыкі і грубаватай бравады выкупляецца шчодрай кампазітарскай вынаходлівасцю, арыгінальнасцю прыёмаў фартэпіяннай і аркестравай (струнны аркестр і труба-сола) ігры, музычнай дасціпнасцю. Міхаіл Васкрасенскі сыграў канцэрт так дынамічна і кідка, з такой падкупляючай перакананасцю ў мастацкай каштоўнасці гэтай музыкі, што прымусіў і слухачоў паверыць у гэта.

Скрыпічны канцэрт (1948 год; у анатацыі філармоніі быў чамусьці памылкова названы 1954 год, першае выкананне канцэрта адбылося ў 1955 годзе) належыць да ліку вышэйшых дасягненняў Шастаковіча ў той галіне, якую можна было б назваць трагедыйнай. Кампазітар нібы ўспамінае пра жорсткую барацьбу з ворагамі ў гады вайны; ім валодаюць думкі пра бядоты і пакуты, якія і сёння пагражаюць чалавецтву. Адсюль палымяны пратэст супраць сіл зла. Але кампазітар верыць у перамогу дабра, і канцэрт завяршаецца сцвярджэннем хараства чалавечага жыцця, радасці быцця. Увесь гэты складаны і багаты змест Шастаковіч увасобіў у арыгінальнай форме, якая патрабуе ад выканаўцы, каб ён быў не толькі скрыпачом-віртуозам, але і мастаком-мыслярам. Вось гэтага якраз і не хапала Рафаілу Сабалеўскаму. Яго выкананне было адточанае, гладкае, тэхнічна досыць дасканалае, але пазбаўленае ўнутранага напалу; у ім не пульсавала неспакойная і дапытлівая думка, без якой няма трагедыйнага Шастаковіча.

Такім чынам, сыграны дзве праграмы з твораў Шастаковіча. Адбыліся і іншыя канцэрты пачатку сезона. Канцэрты паказалі, што Дзяржаўны сімфанічны аркестр БССР і дырыжор В. Катаеў пакуль што выступаюць няроўна. Высокія выканаўчыя дасягненні суседнічаюць з выступленнямі, якія пакідаюць у слухачоў асадак незадаволенасці. Ці не вынік гэта занадта вялікай нагрузкі, якая адразу лягла на плечы калектыву? Ці ўсё правільна ў арганізацыі рэпетыцыйнай работы і канцэртных выступленняў нашага адзінага ў рэспубліцы сімфанічнага аркестра?

Вельмі хочацца, каб калектыў хутчэй дасягнуў той высокай ступені выканаўчага майстэрства, на якую ён, бясспрэчна, можа ўзняцца.

Л. АЎЭРБАХ.

НЕ ВАМ БЕЛАРУСАМІ ЗВАЦЦА!

Калісьці яны гарнуліся да тапарышча скрываўленай сякеры, выслужваліся перад «арыйскімі» забойцамі. А цяпер гэтыя адшчапенцы, здраднікі, гітлераўскія злачынцы просяцца ў сябры да беларускага народа, хочуць прымазацца да яго культуры... Дарэмна! Кульгавы воўк за лісу не стане.

Сёння мы змяшчаем водпаведзь групы маладых беларускіх літаратараў на «галасы з таго свету».

Для нас, маладых беларускіх пісьменнікаў, няма нічога больш дарагога, чым маці Беларусь, зямля нашых продкаў, край славуты і чароўны. Тут мы нарадзіліся, тут сэрцам сваім слухалі матчыны песні, тут выйшлі на прасторы жыцця, тут пішам свае кнігі і гадуем дзяцей. Кожнай хвілінай жыцця, кожнай крывінкай звязаны мы з зямлёй гэтай і добра ведаем яе гісторыю, яе радасці і нягоды, з гонарам называем сябе беларусамі.

Недзе ж на Захадзе—хто за акіянам, а хто блізкага—жыве кучка адшчапенцаў, якія таксама называюць сябе беларусамі. Выкінутыя самой гісторыяй з зямлі, дзе нарадзіліся, асуджаныя самім народам за справы брудныя і крывавыя, яны выдаюць сябе за змагароў, «ваююць» за нейкі новы лёс для Беларусі, як быццам беларусы не абралі сабе дарогу, як быццам Вашынгтон ці Лондан вырашаюць наш сённяшні і заўтрашні дзень. Колькі часу яны не хочуць змірыцца з тым, што не можа быць і няма ніякай іншай Беларусі, акрамя Беларусі Савецкай, што не патрэбен беларускаму народу ніякі іншы лад, акрамя Савецкага ладу. Смешна слухаць плявузганне аб нібыта заняволенай Беларусі, аб шчасці, якое прынясуць нам з Захаду былыя паплеччнікі гітлераўскіх галавасцяў, адданыя служкі доларавага мяшка. Выбачайце, панове, мы таго заходняга шчасця паспыталі даволі, мы таго «новага парадку» і цяпер забыць не можам. Не высахлі яшчэ ў нашых матак слёзы, не зажылі ў нашых бацькоў раны...

Апошні час друк і радыё беларускіх буржуазных нацыяналістаў праяўляе даволі вялікую ўвагу да творчасці літаратурнай моладзі, да нашай творчасці. Цытуюцца нашы вершы і апавяданні, каменціруюцца нашы выступленні, даюцца рэцэпты на будучае. І ўсё гэта дзеля таго, каб даказаць, што нібыта «маладыя пісьменнікі... адхіліліся ад партыйнай лініі», што, маўляў, «сучасная моладзь імкнецца выйсці на шлях праўды, свабоднага слова...».

Бедныя «спадары», мы разумеем, як вам цяжка там! Мы нават здзіўляемся вашай вынаходлівасці—так вы налаўчыліся перакручваць факты, скажаць цытаты, выдаваць чорнае за белае і наадварот. Ды наўрад ці знаходзяцца людзі, якія вераць вам, якія ўсур'ёз прымаюць вашы «адкрыцці», бо кожны добра ведае, што вы даўно прадалі зямлю, у любві да якой цяпер клянецеся.

Вы спрабуеце нас вучыць, панове, спрабуеце заігрываць з намі, прыкідваецеся добразычліўцамі. Вам вельмі хацелася б, каб мы хоць разок, хоць ледзь-ледзь падзьмулі ў вашу дудку. Але ж ведайце—гэтага не будзе! Бацькі нашы, якія прайшлі дарогамі вайны, на грудзях якіх ордэны і медалі, навучылі нас разбірацца, дзе сябры, а дзе ворагі. І самі мы ўжо добра ведаем, дзеля чаго жывём на зямлі. І недахопы нашы, і нягоды нашы мы бачым і ведаем лепш, чым вы, і справімся мы з імі як-небудзь без вашай дапамогі.

Вы кажаце, што многія з нас нібыта «адхіліліся ад партыйнай лініі». Святая прастата! Лінія партыі, ачышчаная ад скажэнняў культу асобы, ад валюнтарызму і кан'юнктуршчыны,—наша лінія. Тым часам вам карысна было б ведаць і тое, што многія з беларускіх маладых пісьменнікаў з гонарам носяць партыйныя білеты.

Вашы спадзяванні на ідэалагічныя дыверсіі дарэмныя. Іх ніколі не будзе!

І яшчэ адно. Той-сёй з так званых эмігрантаў спрабуе свае сілы ў літаратурнай крытыцы, з разумным выглядам разважае аб мастацкіх якасцях нашых твораў. Асабліва актыўнічае, кажуць, Станіслаў Станкевіч, былы фашысцкі бургамістр Барысава. Дык яму мы хацелі б напомніць словы выдатнага ўкраінскага пісьменніка Астапа Вішні: «Уваходзячы ў літаратуру, выцірайце ногі». Вам жа, спадар Станкевіч, трэба добра выцерці рукі, бо яны ў крыві нявінных нашых землякоў, якіх вы сотнямі падстаўлялі пад кулі фашыстаў. І не толькі вам. Гэта датычыць таксама Р. Казака (Крушыны-Рамановіча), Ю. Віцьбіча (Стукаліча), Аляксандра Качана (Акулы-Козыра) і іншых. Не вам і не вашым хаўрускам гаварыць пра літаратуру, якая сцвярджае вялікія ідэі сапраўднай чалавечнасці, не вам гаварыць пра волю і справядлівасць! Прадаўшыся адзін раз, цяжка, відаць, утрымацца, каб не прадацца і другі. Прадаўшыся фашыстам, вам лёгка было старгавацца з гаспадаром доларавага мяшка. І вы служыце амерыканскаму імперыялізму верна, вы са скуры вылузваецеся, каб мець сваіх трыццаць срэбранікаў. Што ж, кожнаму сваё.

Але мы ніколі не блыталі вас са шматлікімі эмігрантамі, нашымі землякамі, сумленнымі людзьмі, якія па волі лёсу, па розных акалічнасцях апынуліся за мяжой. Не хавайцеся за іх спіны!

І не прымешвайце да сваіх брудных спраў Беларусь—святую зямлю. Не называйцеся беларусамі—вы гэтага не заслужылі. Не спадзявайцеся на наша разуменне ці падтрымку—нам з вамі не па дарозе. Мы не ведаем ніякай іншай улады, акрамя савецкай. Ёй мы будзем служыць і жыццём сваім, і сваім беларускім словам—у імя шчасця нашай маці Беларусі, якая квітнее ў дружнай сям'і сваіх шматлікіх сясцёр, у адзінай Савецкай сацыялістычнай дзяржаве.

Рыгор БАРАДУЛІН,
Генадзь БУРАЎКІН,
Васіль БЫКАЎ,
Анатоль ВЯРЦІНСКІ,
Ніл ГІЛЕВІЧ,
Іван ПТАШНІКАЎ,
Барыс САЧАНКА,
Іван ЧЫГРЫНАЎ.

ЛАЎРЭАТЫ РАСІІ

Савет Міністраў РСФСР разгледзеў пытанне аб прысуджэнні Дзяржаўных прэмій РСФСР за выдатныя творы літаратуры, мастацтва і выканаўчае майстэрства.

Савет Міністраў Расійскай Федэрацыі прыняў прапановы Камісіі па Дзяржаўных прэміях РСФСР і прысудзіў Дзяржаўныя прэміі РСФСР 1966 года:

У галіне літаратуры — прэміі імя М. Горкага:

Аляксееву М. М.—за раман «Вішнёвы вір»; **Кулешову К. Ш.**—за кнігу вершаў «Паранены камень»; **Мартынаву Л. М.**—за кнігу вершаў «Першароднасць».

У галіне выяўленчага мастацтва — прэміі імя І. Рэпіна:

Коржаву Г. М.—за трыпціх «Камуністы»—карціны «Інтэрнацыянал», «Падымаючы сцяг», «Гамер (Рабочая студыя)»; **Майсеенка Е. Е.**—за карціну «Чырвоныя прыйшлі»; **Цыгалю В. Е.** — за помнік Герою Савецкага Саюза генерал-лейтэнанту Карбышаву Д. М. у Маутхаузене (Аўстрыя).

У галіне музычнага мастацтва —прэміі імя М. Глінкі:

Кабалеўскаму Д. Б.—за «Рэквіем» для салістаў, двух хораў і сімфанічнага аркестра; **Шапорыну Ю. А.**—за оперу «Дзекабрысты» і араторыю «Дакуль каршуну кружыць»; **Аборыну Л. Н.**—за канцэртна-выканаўчую дзейнасць.

У галіне тэатральнага мастацтва — прэміі імя К. Станіслаўскага:

Барысавай Ю. К.—за выкананне роляў: Валі ў спектаклі «Іркуцкая гісторыя», Паўліны Казанец у спектаклі «Кухарка замужам» і Маўры Пакрытчанка ў спектаклі «Праўда і крыўда» ў Дзяржаўным акадэмічным тэатры імя Яўг. Вахтангава; **Сіманаву Н. К.** — за выкананне роляў Мацяса Клаузена ў спектаклі «Перад заходам сонца» і Сальеры ў спектаклі «Маленькія трагедыі» ў Ленінградскім дзяржаўным акадэмічным тэатры драмы імя А. С. Пушкіна; **Маркаву П. А.**—за кнігі «Праўда тэатра» і «Рэжысура Ул. І. Неміровіча-Данчанкі ў музычным тэатры».

У галіне кінамастацтва — прэміі імя братоў Васільевых:

Фрадкіну Г. Е., Цяпкіну Ф. А., Кансоўскаму А. А. — за навукова-папулярныя фільмы: «Рукапісы Ул. І. Леніна», «Сцяг партыі», «Ленін (Апошнія старонкі)»; **Столперу А. Б., Сіманаву К. М., Аланоўскаму Н. В., Папанаву А. Д.**—за мастацкі фільм «Жывыя і мёртвыя»; **Ромму М. І., Храбравіцкаму Д. Я., Лаўрову Г. Н., Калганаву Г. Н., Баталаву А. В.**—за мастацкі фільм «Дзевяць дзён аднаго года».

Дзеячам літаратуры і мастацтва, удастоеным Дзяржаўнай прэміі, прысвоена званне «Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі РСФСР» з уручэннем ганаровага знака і дыплома.

Выйшлі з друку

ВЫДАВЕЦТВА «БЕЛАРУСЬ»

Генадзь Бураўкін. Дыханне. Паэзія. Мастак Б. Забораў. 1966 г. Тыраж 5.500 экз., 104 стар. Цана 16 кап.

Вісарыён Гарбук. На маім акне. Мастак Ю. Селіверстаў. 1966 г. Тыраж 40.000 экз., 18 стар. Цана 20 кап.

Сяргей Грахоўскі. Гарыць касцёр. Вершы. Мастак С. Кавалёў. 1966 г. Тыраж 15.000 экз., 60 стар. Цана 26 кап.

Авяр'ян Дзеружынскі. Птушыныя галасы. Вершы. Мастак В. Ціхановіч. На рускай мове. 1966 г. Тыраж 50.000 экз., 32 стар. Цана 15 кап.

Януб Колас. На ростанях. Трылогія. Мастак С. Раманаў. 1966 г. Тыраж 20.000 экз., 612 стар. Цана 1 руб. 42 кап.

Лірычныя песні. Мастацкай самадзейнасці. Мастак С. Кавалёў. 1966 г. Тыраж 4.000 экз., 48 стар. Цана 30 кап.

Іван Навуменка. Таполі юнацтва. Апавяданні. Мастак П. Калінін. 1966 г. Тыраж 9.000 экз., 240 стар. Цана 38 кап.

Песні аб Леніне і партыі. Мастацкай самадзейнасці. Склаў Н. Хаухлянцаў. Мастак С. Кавалёў. 1966 г. Тыраж 4.000 экз., 48 стар. Цана 33 кап.

Песні для хору з фартэпіяна або баянам. Мастацкай самадзейнасці. Склаў К. Паплаўскі. Мастак С. Кавалёў. 1966 г. Тыраж 3.600 экз., 48 стар. Цана 36 кап.

Рэпертуар баяніста. Мастацкай самадзейнасці. Склаў В. Куніцкі. Мастак С. Кавалёў. 1966 г. Тыраж 4.960 экз., 32 стар. Цана 30 кап.

Рэпертуар скрыпача. Зборнік. Вокладка мастакоў А. Бакуменка і В. Сакалова. 1966 г. Тыраж 600 экз., 32 стар. Цана 66 кап.

А. Ракітніцкі. У дапамогу аматару шашак. Мастак І. Владычак. На рускай мове. 1966 г. Тыраж 20.000 экз., 308 стар. Цана 51 кап.

Максім Танк. Збор твораў у чатырох тамах. Том першы (На этапах. Журавінавы цвет. Нарач. Пад мачтай. Праз вогнены небасхіл. Янук Сяліба). Мастак Б. Забораў. 1966 г. Тыраж 8.000 экз., 576 стар. Цана 1 руб. 16 кап.

Уладзімір Шахавец. Пісьмо да сябра. Мастак П. Калінін. 1966 г. Тыраж 10.000 экз., 96 стар. Цана 15 кап.

ВЫДАВЕЦТВА «НАРОДНАЯ АСВЕТА»

Пятрусь Броўка. Вершы і паэмы. Школьная бібліятэка. Мастак Ю. Пучынскі. 1966 г. Тыраж 12.000 экз., 172 стар. Цана 21 кап.

А. Матусевіч, К. Кобызева. Дыдактычны матэрыял па беларускай мове. II—IV кл. 1966 г. Тыраж 18.000 экз., 573 стар. Цана 21 кап.

Уладзімір Міцкевіч. Максім Танк у школе. Дапаможнік для выкладчыкаў беларускай літаратуры. 1966 г. Тыраж 11.800 экз., 116 стар. Цана 18 кап.

Ого, кольні тут цудаў! Паспрабуй разбярыся адразу! І пра вясёлага Мыйдадзіра хочацца купіць, і пра ката Васіля, які верна служыў свайму гаспадару, і пра тое, як у Вавёркі разбалеліся зубкі... Эх, шкада, мама дала толькі на марожанае ды кіно! Але ж можна абысціся і без марожанага. Затое якая кніжка ў мяне будзе! Фота Ул. КРУКА.

Сярод кніг

З ДУМАЙ ПРА РОДНЫ КРАЙ

Калі мы сёння з вялікай хвалай гаворым пра кнігу Генадзя Кісялёва «З думай пра Беларусь», то перш за ўсё трэба адзначыць, што поспех яе—гэта ў вялікай ступені поспех плённага супрацоўніцтва гісторыі і літаратуразнаўства, іх жадання падаць адно аднаму руку ўзаемадапамогі.

Не дзіва, што яшчэ ў першай сваёй кнізе «Сейбіты вечнага» (1963) Генадзь Кісялёў працу гісторыка параўноўваў з працай чалавека сумежнай прафесіі—мастака-рэстаўратара. Працэс узнаўлення мінулага ў іх аднолькавы: «знімі асцярожна напластаванні пазнейшага часу, збяры разам кавалкі гістарычнай тканіны, улавіўшы істотнае, дамалюй страчаныя дэталі—і вобраз мінулага заззяе свежымі фарбамі, набудзе новае жыццё».

Але гэта, так сказаць, толькі методыка працы, шлях, па якім ідзе гісторык грамадства альбо гісторык літаратуры. Аднак — і гэта асабліва важна!—у «рэстаўратара» павінна быць мэта, да якой ён імкнецца, у імя якой, уласна кажучы, ён і ідзе па выбраным шляху.

Калісьці Максім Рыльскі вельмі хораша сказаў: «Хто не знае свайго мінулага, той не варты свайго будучага. Хто не шануе выдатных людзей свайго народа, той сам не варты пашаны». І заслуга Генадзя Кісялёва заключаецца менавіта ў тым, што з думай пра Беларусь, пра яе светлае будучае, ён, не шкадуючы сіл і часу, рупліва і настойліва ўзнаўляе мінулае нашага народа, рэстаўрыруе гісторыю бацькаўшчыны. Неабходна адразу ж падкрэсліць тую аб'ектыўнасць, з якой гісторык-марксіст узнаўляе кожную рыску гэтай гісторыі, паказваючы пры гэтым не абы якое рэстаўратарскае майстэрства. Не ў прыклад некаторым вучоным, Генадзь Кісялёў у імя навуковай аб'ектыўнасці не баіцца адступіць ад сваіх ранейшых сцвярджэнняў, калі яны аказваюцца памылковымі, прама ўказвае на паасобныя «агрэхі», што былі ў... папярэдніх работах».

Наогул навуковай этыцы ў Генадзя Кісялёва можна павучыцца. Пра жыццёвы і творчы шлях Кастуся Каліноўскага і Францішка Багушэвіча да сённяшняга дня напісана нямала, многае знойдзена і даследавана. Таму, безумоўна, нялёгка выбрацца з палону раней усталяваных поглядаў, думак. Аднак даследчык нідзе не выдае чужых меркаванняў, ацэнак за свае; крытыкуючы палажэнні асобных аўтараў, ён, разам з тым, зацікаўлена «вылушчвае» з іх прац найбольш каштоўнае, самастойнае, «сваё». З тым большай відавочнасцю праглядваецца ў кнізе арыгінальнасць меркаванняў самога Генадзя Кісялёва, навізна і грунтоўнасць фактаў, якія ён уводзіць у навуковы ўжытак. А фактаў гэтых сапраўды нямала.

Дастаткова сказаць, што ў артыкуле «Францішак Багушэвіч і Ян Карловіч» даследчык аналізуе 62 дакументы (51 ліст, 9 паштовак, 1 тэлеграма, 1 візітная картка), якія належаць класіку беларускай літаратуры і якія дагэтуль былі зусім невядомыя літаратуразнаўцам; у артыкуле «Мужыцкі адвакат» — яшчэ тры лісты (да Адама Карповіча, удзельніка паўстання 1863 года). Такім чынам, дзякуючы знаходкам Генадзя Кісялёва; эпістолія Францішка Багушэвіча адразу адчувальна папоўнілася, паглыбілася і наша ўяўленне пра духоўны свет пісьменніка, пра кола яго клопатаў на працягу цэлага дзесяцігоддзя (з 1887 па 1896 год). Так, мы даведваемся пра намер Багушэвіча стварыць тлумачальны слоўнік беларускай мовы (намер, які на наш сорам, не ажыццёўлены яшчэ нават цэлым Інстытутам мовазнаўства), турботы пісьменніка аб напісанні граматыкі беларускай мовы (за колькі год да Б. Тарашкевіча!). Лісты праліваюць святло не толькі на Багушэвічавы літаратурныя справы (надрукаванне зборніка «Дудка беларуская», спулкаванне з Элізай Ажэшка, гісторыя напісання асобных твораў і інш.), але і на яго справы гаспадарчыя (кіраванне маёнткам Яна Карловіча ў Вішневе, штодзённыя імкненні выбіцца з галечы).

Зразумела, што даследчык прыводзіць толькі невялікія ўрыўкі з лістоў Францішка Багушэвіча, якімі ён хоча падмацаваць тую ці іншую сваю думку. А нам, чытачам, хацелася б прачытаць усю знойдзеную перапіску пісьменніка. Таму, думаецца, кніга толькі б выйграла, калі б у ёй у выглядзе дадатка былі надрукаваны лісты аўтара «Дудкі беларускай» да Яна Карловіча. Забягаючы наперад, скажу, што гэтае меркаванне хацелася б дастасаваць і да газеты Кастуся Каліноўскага «Мужыцкая праўда». Справа ў тым, што да гэтага часу мы не маем пад рукамі поўнай публікацыі матэрыялаў газеты. Праўда, усе яе сем нумароў былі перадрукаваны ў зборніку «Революционный подъем в Литве и Белоруссии в 1861—1862 гг» («Наука», 1964), але чамусьці толькі ў перакладзе на рускую мову. Таму, паўтараю, вельмі не лішне было б перадрукаваць у дадатку да кнігі «лятаючыя лісткі» (А. Герцэн) Кастуся Каліноўскага.

Беларускаму рэвалюцыянеру-дэмакрату, вялікаму сыну зямлі беларускай у кнізе прысвечаны непасрэдна два артыкулы: «Так сейце ж, дзецюкі!..» (пра пашырэнне ў народзе «Мужыцкай праўды») і «Летапіс жыцця і дзейнасці Кастуся Каліноўскага». Аднак і трэці артыкул, пра Фелікса Зянковіча («Па слядах аднаго пісьма М. П. Агарова і А. І. Герцэна») цікавы не толькі тым, што ўваскрашае багаты жыццяпіс аднаго з удзельнікаў паўстання 1863 года, а, перш за ўсё, і сваёй мэтаскіраванасцю — паказаць Ф. Зянковіча як памочніка Каліноўскага па кіраўніцтву паўстаўннем, як «яшчэ адно звяно, што звязвае беларускага рэвалюцыянера з Герцэнам». Менавіта гэта, не прыцьміўшы мужнага лёсу самога Ф. Зянковіча, дазволіла вучонаму ўпісаць яшчэ адну старонку ў каліноўсказнаўства.

Вызначаючы асноўнае ў светапоглядзе і дзейнасці Кастуся Каліноўскага, Генадзь Кісялёў вельмі слушна ўказвае на наступныя «дзве акалічнасці»: «1. На ўсіх этапах свядомага жыцця ён упарта і настойліва змагаўся за рэвалюцыйна-дэмакратычную праграму, узначальваў левае крыло, стаяў на паслядоўна рэвалюцыйных пазіцыях. 2. Нязменнай яго спадарожніцай была мова яго народа, беларуская мова. Ён выдатна ведаў і любіў яе. Там, дзе з'яўляўся Каліноўскі, выдаваліся беларускія адозвы і газеты. Нават у турме, калі над ім навісла пятля ката, ён піша пісьмы і вершы на мове беларускіх сялян. Ён быў буйным дзеячом беларускай дэмакратычнай культуры, пісьменнікам і паэтам, стваральнікам баявой беларускай публіцыстыкі». У ліпені 1862 года гэтыя «дзве акалічнасці» — родная мова і палымяная рэвалюцыйнасць — упершыню ў гісторыі Беларусі перакрыжаваліся, нарадзілася першая беларуская газета і, як удала сказаў даследчык, — **«рэвалюцыя загаварыла па-беларуску».**

«Мужыцкая праўда», гэтая «родная сястра па духу «Современника» і «Колокола», была для царскіх сатрапаў страшнейшай за ўсялякую зброю. Дастаткова сказаць, што першае пакаранне смерцю ў Мінску (21 мая 1863 года) і ў Вільні (22 мая 1863 года) было звязана менавіта з чытаннем і распаўсюджваннем «Мужыцкай праўды». Нягледзячы на гэта, газета за кароткі час абышла амаль усю Беларусь, яе чыталі ў Літве, Латвіі, Польшчы. У Лондане прыкмеціў і ўхвальна адгукнуўся пра яе Герцэн. Генадзь Кісялёў скрупулёзна сабраў і аргументавана пракаменціраваў шматлікія факты распаўсюджвання газеты сярод усіх слаёў насельніцтва «заходнерускага» краю. Пасля архіўных знаходак Генадзя Кісялёва можна без перабольшання назваць «Мужыцкую праўду» **народным** выданнем.

«Летапіс жыцця і дзейнасці Кастуся Каліноўскага» цікавы перш за ўсё тым, што ён упершыню ў нашай гістарычнай навуцы сістэматызуе навукова вывераныя факты, звязаныя з жыццём і рэвалюцыйнай дзейнасцю нацыянальнага героя беларускага народа.

І ўсё-такі галоўных старонак у каліноўсказнаўства мы пакуль яшчэ не ўпісалі. І тут, безумоўна, не віна аўтара «Летапісу», а наша агульная віна. Дзе, скажыце, знайсці добрую мастацкую кнігу пра Каліноўскага, пра паўстанне 1863 года? Чаму дагэтуль на кінастудыі «Беларусьфільм» не думаюць пра стварэнне паўнаметражнага мастацкага фільма аб Каліноўскім? Прайшлі «круглыя» даты, а Міністэрства сувязі БССР не выпусціла ў свет хаця б юбілейную марку з адбіткам змагара за народнае шчасце. Да сённяшняга дня ў Гродна не стаіць помнік Каліноўскаму, хаця пра гэта гаварылася гучна і даўно. Урэшце рэшт, чамусьці яшчэ не вядзецца гаворка пра стварэнне музея Кастуся Каліноўскага, нягледзячы на тое, што, мяркуючы па «Летапісу», у грамадскіх установах і прыватных асоб сабралася нямала цікавых музейных экспанатаў.

І ў заключэнне (у каторы ўжо раз!)—пра тыраж кнігі. У плане выдавецтва стаяла пяць тысяч экземпляраў, кнігагандаль «зрэзаў» на тры тысячы. І што ж? У кнігарнях кнігі ўжо няма. Суміруючы гэты факт з дзесяткамі аналагічных, можна прыйсці да вельмі сумнай высновы: ва ўмовах Беларусі ў справах тыражавання кнігагандаль часта перашкаджае пашырэнню беларускай кнігі.

В. РАГОЙША.

Яўген КАРШУКОЎ

— Шурачка, глядзі, хто да нас прыйшоў! Сцяпан... Якая дакладнасць! Дамовіліся ў сем раніцы—і ён кропелька ў кропельку. Ты даруй, мы са сваёй Аляксандрай Пятроўнай заспалі нешта... У нядзелю так соладка спіцца, о-ох! Яшчэ нават не снедалі... Чакай, а што ты стаіш на парозе? Скідай, скідай свой рукзак, пастаў у кут вуды, вось так, і хутчэй сюды, пакуль свінінка на патэльні гарачая. Паспееш яшчэ адпачыць на ўлонні прыроды... А цешча ў мяне малайчына, бачыш, якіх блінцоў напякла? Такіх ты, мусіць, яшчэ і не еў ніколі... Матуля, га матуля, нясіце хутчэй графінчыкі! Ты.. не п'еш? Шурачка, няўжо гэта я некалі быў такім маладым-зялёным? Ха-ха!.. Дзівак чалавек! Мы ж з табой не так часта сустракаемся... Ну, не дуры, давай чокнемся... Не, Сцяпан, так справа не пойдзе! Не паважаеш мяне, дык хоць паважай Шурачку і цешчу... За нашых савецкіх жанчын, як кажуць! А-а-а, то-то ж і яно. За іх сорамна не выпіць... Закусвай... Каньячок што трэба, вытрыманы. Ведаеш, мы ўчора ўвесь вечар прагаварылі з жонкай, як правядзём гэты выхадны. На рацэ, у лесе... Паверыш, я ўжо і не памятаю, калі, у якім годзе на ўлонні прыроды адпачываў... Усё часу не выберу, усё ў гэтых сценах сядзіш. Але... хопіць. З сённяшняга дня кожную нядзелю—за горад. Спакусіў ты мяне сваімі апавяданнямі... Шурачка, уяўляеш, як прыемна ля агню ў лесе, на стромкім беразе нашага Сожа? З ракі цябе вецярком халоднекім абвявае, з лесу—пах хвоі, а пад носам—юшка з яршоў водар пускае... Цудоўна! Не, за гэта нельга не выпіць... Сцяпан, не будзь бабай! Выпі, каму кажу... Лепш кляваць будзе. Га? Не хочаш—як хочаш. Не ўмею я ўгаворваць. Не п'еш—тады не крыўдуй, мы з Шурачкай... Фу-у-у, хто толькі каньяк гэты п'е? Дык ты кажаш, што камары там не вельмі непакояць? Не брэшаш, Сцяпан? Ну, глядзі, глядзі... Я іх, паганцаў, во як не цярплю. Пікіруюць над самым вухам—з-зм, з-зм... А потым пачнуць джгаць— ніякага ратунку. І агонь твой, Сцяпан, не паможа.... Ну, давай яшчэ па маленькай. Пайшло!.. Адчуваеш, Шурачка, усё цела наліваецца прыемным цяплом... Добры каньячок! Дальбог, і дома можна добра правесці час. Што, трэба ісці ўжо! На цеплаход спознімся? Нічога, Сцяпанка, другім рэйсам паплывём... А на стале пакідаць недапітую пляшку — браце мой, недаравальна... Ма-ту-ля! Дзе вы? Яшчэ нам графінчык... Вось так. Дзякую. Зараз мы яго, роднянькага... Выхадны ж сёння, Сцёпа! Для таго ён і даецца рабочаму чалавеку, каб па-людску адпачыць... Сцёпа, ты куды? Пачакай, пачакай, давай заспяваем разам... Не хочаш?.. Ну, ідзі, ідзі... І я пайду... Спаць.

Генадзь Кісялёў. «З думай пра Беларусь». Выдавецтва «Беларусь». Мінск, 1966.

12 кастрычніка ў Маскве, у Цэнтральным Доме літаратараў адбылося ўрачыстае адкрыццё Дзён балгарскай літаратуры ў Савецкім Саюзе. Уступнае слова аб развіцці савецка-балгарскіх літаратурных сувязей сказаў Барыс Палявой. Член-карэспандэнт Акадэміі навук СССР Дзмітрый Маркаў расказаў аб творчых поспехах балгарскіх пісьменнікаў, аб найбольш значных з'явах сучаснай балгарскай літаратуры.

Добра ведае кнігі балгарскіх пісьменнікаў і наш беларускі чытач. У Дні балгарскай літаратуры ён праяўляе яшчэ большую цікавасць да творчасці майстроў слова братняй краіны.

Змяшчаем артыкул перакладчыка з балгарскай мовы Ванкарэма Нікіфаровіча аб сённяшнім дні балгарскай літаратуры.

АД СТРОМ БАЛКАНСКІХ

Дні балгарскай літаратуры, якія праводзяцца ў агульнасаюзным маштабе,—сапраўднае свята культуры савецкага і балгарскага народаў. Прыемна адзначыць, што беларускім перакладчыкам ёсць што паказаць, ёсць аб чым гаварыць у гэтыя дні. На беларускай мове гучаць многія выдатныя творы балгарскіх паэтаў і празаікаў.

У гэтыя дні хочацца яшчэ раз нагадаць сустрэчы з балгарскімі сябрамі, з цікавымі творамі сучаснай балгарскай літаратуры.

Сёння амаль ва ўсіх жанрах балгарскай літаратуры пераважае сучасная тэма. Балгарскія пісьменнікі многа і ўсхвалявана пішуць пра тыя істотныя змены, што адбыліся ў жыцці народа за дваццаць год. Прычым у апошнія два-тры гады вельмі прыкметны паварот ад канстатацыі знешніх з'яў, фактаў і падзей да паглыбленага псіхалагічнага аналізу, да паказу ўнутранага свету герояў.

Гэта можна прасачыць на творчасці многіх пісьменнікаў. Здаўна, напрыклад, цікавіцца жыццём рабочага класа выдатны балгарскі празаік Камен Калчаў. Шырока вядома яго эпапея «Сям'я ткачоў» аб жыцці і барацьбе рабочых у буржуазнай Балгарыі. Ён — аўтар цікавай кнігі «Сын рабочага класа», белетрызаванай біяграфіі Георгія Дзімітрава. Беларускаму чытачу вядома яго аповесць «Закаханыя птушкі». Але найбольшай псіхалагічнай глыбінёй вылучаюцца апошнія творы К. Калчава — раманы «Ля вытокаў жыцця» і «Двое ў новым горадзе» і аповесць «У сакавіку». У іх аўтар імкнецца да ўсебаковага раскрыцця характараў герояў у сувязі з тымі зменамі, што адбыліся пасля XX з'езда КПСС і VIII з'езда БКП. Раман «Двое ў новым горадзе», у якім вельмі востры псіхалагічны канфлікт, вострыя сітуацыі, прасякнуты пафасам жыццесцвярджэння, непрымірымасцю да фальшу, да беззаконня, да ўсяго несумленнага.

Празаіка Андрэя Гуляшкі многія ведаюць па рускіх перакладах яго раманаў аб паслявераснёўскім жыцці балгарскай вёскі. У апошнія пяць-шэсць год ён стварае серыю прыгодніцкіх аповесцей — «Контрразведка», «Маленькая начная музыка», «Спячая прыгажуня» і іншыя, — якія аб'яднаны галоўнай дзеючай асобай — разведчыкам Авакумам Захавым. Дэтэктыўна-прыгодніцкая серыя Андрэя Гуляшкі ў сваёй аснове палемічная. Пісьменнік імкнецца да стварэння псіхалагічна пераканаўчага вобраза чэкіста, супрацьпастаўляючы яго славутаму на Захадзе Джэмсу Бонду з раманаў Флемінга. Сутычка паміж імі — сутычка двух светаў, дзвюх ідэалогій. Авакум Захаў перамагае, таму што ён узброены самым сумленным, самым перадавым светапоглядам, таму што ён працуе для свайго народа, для яго будучыні.

У сувязі з выхадам гэтых аповесцей Андрэя Гуляшкі, а таксама дэтэктыўных твораў Паўла Вежынава і Багаміла Райнава на старонках балгарскіх літаратурных газет і часопісаў разгарнулася дыскусія аб праваменасці і «сур'ёзнасці» крымінальна-прыгодніцкага жанру. Удзельнікі дыскусіі выказалі шмат цікавых думак аб законах гэтага жанру, аб сродках псіхалагізацыі герояў, параўноўвалі дэтэктывы, створаныя на Захадзе і ў сацыялістычных краінах.

Андрэй Гуляшкі не абмяжоўваецца дэтэктыўным жанрам. Ён стварыў у апошні час раман «Сем дзён нашага жыцця», прысвечаны самым актуальным праблемам сучаснасці. У вобразе галоўнага героя пісьменнік імкнецца ўвасобіць лепшыя рысы сучаснага чалавека, чалавека шырокіх далягляду і глыбокай думкі.

Сярод апошніх навінак балгарскай літаратуры, для якіх характэрна імкненне да псіхалагічнай глыбіні, вылучаецца аповесць Іліі Волена «Йоў». Гэты твор быў адзначаны сёлета Дзімітраўскай прэміяй у галіне літаратуры. Пісьменнік у ім па-майстэрску раскрывае драматызм дуплёўных перажыванняў свяшчэнніка, якому трэба адмовіцца ад сваёй веры, ачысціцца ад усяго, што з ёй звязана, і пачаць новае жыццё.

Нельга гаварыць аб сённяшнім дні балгарскай літаратуры, не ўпамінаючы новых імёнаў, новых твораў прадстаўнікоў больш маладога пакалення пісьменнікаў, якія яшчэ не перакладзены на мовы народаў СССР. У першую чаргу хочацца назваць празаікаў Георгі Маркава і Йордана Радзічкава. Георгі Маркаў — інжынер, ён прыйшоў у літаратуру непасрэдна з заводскага цэха. У зборніках апавяданняў і навел «Паміж днём і ноччу», «Анкета», у рамане «Мужчыны» ён паказаў сябе пісьменнікам, які ўвесь у пошуках, у імкненні сказаць арыгінальна і цікава пра жыццё вялікіх новабудоўляў сучаснай Балгарыі. У зборніках апавяданняў і аповесцей Йордана Радзічкава «Звычайныя рукі», «Перавернутае неба», «Спякотны поўдзень» галоўны герой — балгарскі селянін, які незвычайна любіць сваю зямлю і сваю радзіму, які сваёй самаадданай працай змяняе аблічча роднай зямлі.

Імкненне да ўсебаковага адлюстравання сучаснасці, да глыбокай псіхалагічнай праўды адчуваецца ва ўсіх жанрах сучаснай балгарскай літаратуры. Я не спыняюся спецыяльна на творах балгарскіх паэтаў, таму што самыя апошнія дасягненні балгарскай паэзіі добра вядомы беларускім чытачам па анталогіі «Ад стром балканскіх» у перакладзе Ніла Гілевіча. Хочацца толькі адзначыць пэўныя поспехі балгарскай драматургіі, асабліва новую п'есу Георгія Джагарава «Пракурор».

«Пракурор» — п'еса вельмі вострая. Гэта п'еса пра аблічча камуніста, пра яго высокую годнасць, пра адкрытасць кожнага за ўсё, пра дружбу і вернасць абавязку, пра давер'е да чалавека. Яна ўся пранікнута пераконанасцю ў сіле партыі, вераю ў яе рэвалюцыйныя ідэалы, яе ленінскія прынцыпы. З вялікім поспехам прайшла п'еса Г. Джагарава на сцэнах тэатраў Сафіі, Плоўдзіва, Вялікага Тырнава і іншых гарадоў Балгарыі...

У кароткім артыкуле немагчыма расказаць пра ўсе навінкі балгарскай літаратуры. А варта было б успомніць і цікавую кнігу навел Дзіко Фучаджыева «Гнеўнае падарожжа», і раман Эміла Каралава «Шумелі чынары», і новую аповесць Івайлы Пятрова «Найлепшы грамадзянін рэспублікі», і першы раман паэтэсы Благі Дзімітровай «Шлях да самой сябе», і чацвёртую частку эпапеі Георгія Караславава «Звычайныя людзі», і новыя апавяданні Стаяна Даскалава, Эміліяна Станева, Крума Грыгорава і многіх іншых пісьменнікаў...

Сённяшні дзень балгарскай літаратуры — гэта таксама шматлікія сустрэчы балгарскіх пісьменнікаў з літаратарамі ўсіх кантынентаў, і асабліва з пісьменнікамі балканскіх краін. У Сафіі адбылася Першая сустрэча балканскіх пісьменнікаў у Варне — Першы фестываль балканскіх фільмаў. З 25 жніўня па 1 верасня ў Сафіі працаваў Першы сусветны кангрэс па балканістыцы. Зусім нядаўна Саюз пісьменнікаў Балгарыі правёў IV міжнародны летні семінар па балгарскай мове і літаратуры, на які былі запрошаны перакладчыкі з балгарскай мовы з многіх краін свету. У семінары прымаў удзел і наш прадстаўнік — паэт і перакладчык Ніл Гілевіч.

У гэтыя дні хочацца ўспомніць шчырым словам і нашых сяброў у Балгарыі

Наш госці

СПЯВАЮЦЬ НАШЧАДКІ ГАРЫБАЛЬДЗІ

На рэкламных шчытах беларускай сталіцы з'явіліся афішы: «Спяваюць італьянскія спевакі». А ці будуць гэта вядомыя артысты ці аматары, які іх рэпертуар, нарэшце, хорам ці паасобку будуць спяваць,—пра гэта афішы таямнічна ўмоўчвалі, нібы хацелі заінтрыгаваць публіку, паднесці ёй сюрпрыз.

Усё раскрылася ў пачатку канцэрта. Вядучы—артыст Масканцэрта Ю. Андрэеў пачаў не з традыцыйнага «Пачынаем выступленне...» Цёпла і задушэўна расказаў ён гісторыю, якая мела непасрэднае дачыненне да канцэрта.

...Гэта адбылося ў 1959 годзе ў Рыме, на плошчы Венецыі. Пры велізарным натоўпе людзей праходзілі злёт і ўшанаванне былых італьянскіх партызан, удзельнікаў руху Супраціўлення. У самы разгар народнага свята раптам аб'явіўся неафашыст, які на вачах герояў партызанскай барацьбы нахабна выкінуў руку наперад у фашысцкім прывітанні. Ад нечаканасці плошча замерла. І тады адзін з герояў Супраціўлення, аддзяліўшыся ад натоўпу баявых таварышаў, наблізіўся да фашысцкага малойчыка і тут жа збіў яго з ног сваім жалезным кулаком...

— Гэта быў адзін з удзельнікаў сённяшняга канцэрта,—паведаміў вядучы,—праслаўлены камандзір Гарыбальдзійскай партызанскай брыгады, член кіраўніцтва Генуэзскай правінцыяльнай арганізацыі Італьянскай кампартыі Паола Кастаньіна.

З-за кулісаў на сцэну выйшаў высокі, шыракаплечы мужчына, з адкрытым мужным тварам, і зала сустрэла яго воплескамі. У гады Супраціўлення пра гэтага чалавека па мянушцы «Маланка» складаліся легенды. Партызанская брыгада пад кіраўніцтвам Паола Кастаньіна, у радах якой разам з італьянцамі змагалася нямала савецкіх воінаў, наводзіла жах на фашыстаў сваімі маланкавымі ўдарамі па варожых гарнізонах. У гарах Італіі таксама, як і ў нашых беларускіх партызанскіх лясах, народныя мсціўцы складалі песні пра баявыя паходы і гарачыя бойкі з ворагамі, пра бясстрашныя подзвігі адважных патрыётаў.

Пасля вайны актыўны змагар супраць фашызму камуніст Паола Кастаньіна вырашыў заняцца прапагандай партызанскай народнай творчасці і з дапамогай песень выхоўваць у маладога пакалення Італіі любоў да яе гераічнага мінулага і нянавісць да душыцеляў свабоды. Тры гады назад ён стварыў невялікі вакальна-інструментальны ансамбль «Фольк» («Народны»), які цяпер выступае з канцэртамі ў сябе на радзіме, а іншы раз выязджае і на гастролі за мяжу.

Ансамбль «Фольк»—не прафесіянальны калектыў, ён складаецца з шасці аматараў, некаторыя з якіх адначасова спяваюць і акампаніруюць сабе на гітары або акардэоне.

Стваráючы ансамбль, Кастаньіна запрасіў у яго сваіх таварышаў па зброі, удзельнікаў Супраціўлення Альфрэда Грэкі і П'етра Спаньола. Разам з былым партызанскім камандзірам яны аднавілі ў памяці многія песні, народжаныя ў грозныя ваенныя гады.

Канцэрт нашых гасцей тым і прыкметны, што асноўнае месца ў яго праграме займаюць песні партызанскіх год, песні Супраціўлення, прасякнутыя духам героікі і баявым настроем. Страявыя мужныя песні «Мы—паўстанцы», «Партызанская», заснаваныя на чаканнай рытміцы, спадарожнічалі народным мсціўцам у час баявых маршаў і паходаў, як і вясёлая, жыццярадасная «Гарыбальдзійская брыгада». Характар і агульны настрой гэтых твораў быў натхнёна, са шчырым запалам перададзены выканаўцамі.

У перыяд мінулай вайны было нямала выпадкаў, калі да вядомай усім мелодыі падбіраліся, падтэкстоўваліся новыя словы, і такім чынам нараджаўся новы твор. Відавочна, так іменна была створана песня «Гэтыя чорныя бандыты...» (пра расстрэл партызан фашыстамі), у якой выразна чуецца знаёмы напеў «Санта Лючыя». На італьянскай зямлі прыжылася ў гады вайны і наша славутая «Кацюша»; на яе матыў байцы Супраціўлення склалі сваю песню «Дзьмуць вятры...» Яна выклікала ў зале бурну воплескаў.

Акрамя партызанскіх песень, нашы госці выканалі народныя песні роднага краю, поўныя глыбокага пачуцця і лірычнай прывабнасці. Ансамбль вызначаецца зладжанасцю галасоў і яркім тэмпераментам выканання.

Г. ЗАГАРОДНІ.

ПАД КІРАЎНІЦТВАМ АЎСТРАЛІЙСКАГА ДЫРЫЖОРА

З вялікім, заслужаным поспехам прайшоў канцэрт Дзяржаўнага сімфанічнага аркестра БССР пад кіраўніцтвам аўстралійскага дырыжора Джона Гопкінса. Чым тлумачыцца гэты поспех? Як ні парадаксальна гучыць адказ, але сапраўды ў канцэрце дырыжор не імкнуўся неяк па-свойму прачытаць, вытлумачыць партытуры твораў, што выконваліся. Ён вельмі дакладна прытрымліваўся аўтарскіх заўваг пра тэмп, дынаміку, характар нюансаў, і іменна таму мы з асалодаю ўспрымалі натхнёнае гучанне Другой сімфоніі Сібеліуса, бліскучасць і багацце фарбаў увертюры «Рымскі карнавал» Берліёза, глыбіню і высакароднасць вобразаў скрыпічнага канцэрта Бетховена. Так, у інтэрпрэтацыі Джона Гопкінса няма знешняй вынаходлівасці, ён «давярае» аўтарам і ўсе свае вялікія творчыя намаганні прыкладае не на пошукі дзеля пошукаў, а на глыбокае раскрыццё задумы музыкі, яе вобразнага складу. І тут дырыжору вельмі дапамагаюць яго цудоўная эмацыянальнасць, заўсёды высокамастацкая, без таннай афектацыі і позы, а таксама выдатная пластыка дырыжыравання, як кажуць, «гаворачыя рукі», выключнае адчуванне гукавога светаценю ў велічэзным дыяпазоне—ад патроенага «піяна» да такога ж «фортэ» — і, нарэшце, абвостранае пачуццё формы і структуры твора, логікі развіцця кожнага яго вобраза ў асобным эпізодзе і ва ўсёй музыцы.

Гэтакае шчаслівае спалучэнне янасцей дырыжора і было прычынай таго, што ў канцэрце музыка ўспрымалася вельмі зладжанай, мы сказалі б, нават зграбнай, а калектыў аркестра выконваў праграму з унутраным уздымам і ясным разуменнем творчых функцый кожнага з артыстаў. Што гэта адпавядае сапраўднасці, лёгка давесці на прыкладах выканання сімфоніі Сібеліуса. Успамінаецца цудоўнае «піцыката» кантрабасаў і віяланчэлей у пачатку другой часткі сімфоніі, калі найцішэйшыя гукі набылі быццам незямны характар, а потым зрабіліся фонам для выдатных сола фаготу, кларнета, габоя, валторнаў. Добра прагучала «пераклічка» скрыпак, альтоў, віяланчэлей і кантрабасаў у трэцяй частцы сімфоніі, аркестравае «туці» ў чацвёртай... Але ўсё гэта дэталі. Галоўнае ў тым, што гэтыя вельмі яркія дэталі не парушылі ўспрымання ўсёй сімфоніі Сібеліуса цалкам як твора паэтычнага, шырокага подыху і глыбокага зместу. Дырыжор і аркестр натхнёна і пераканаўча раскрылі і песенны пачатак музыкі, і нацыянальны, фінскі характар вобразаў, і ўвесь комплекс складаных пачуццяў: элегічных, трагедыйных, жыццесцвярджальна-светлых, якія нарадзілі гэтыя гуманістычныя вобразы, гэтую прыгожую, хвалюючую музыку сімфоніі.

«Рымскі карнавал» — другая увертюра Берліёза да яго оперы «Бенвенута Чэліні» — у інтэрпрэтацыі Джона Гопкінса і нашага аркестра таксама цалкам адпавядае аўтарскай задуме. Для выканаўцаў увертюра была не толькі бліскучай па фарбах, віртуознай аркестравай п'есай, як гэты твор часам выконваецца, не, яны здолелі з мноства гукаў і аркестравых тэмбраў «намаляваць» шматфігурнае палатно народнай урачыстасці. Таму і «бег» скрыпак і духавых, і сола англійскага рожка, і іншыя віртуозныя эпізоды увертюры не ўспрымаліся ў канцэрце як тэхнічныя сведчанні майстэрства выканаўцаў, але як жанравыя замалёўкі свята масленіцы ў сярэдневяковым Рыме. Тут тэхніка не засланяла вобраза, наадварот, яна рабілася нябачнай.

Верны свайму творчаму прынцыпу выконваць твор так, як ён напісаны ў аўтара (гэта значыць—прытрымлівацца не толькі нотаў, але і тэмпаў, нюансаў), Джон Гопкінс скрыпічны канцэрт Бетховена трактуе больш стрымана, чым яго звычайна іграе лаўрэат Міжнароднага конкурсу Нэлі Школьнікава. У яе вялікі тэхнічны апарат, моцны, прыгожы гук, па-мужчынску валявыя штрыхі, але таму, што дырыжор няспынна трымаў скрыпачку ў «ланцугу» тэмпаў акампанементу, выкананню канцэрта не хапіла «палёту», твор прагучаў неяк пацяжэлым.

Нарэшце, дазволю сабе зрабіць заўвагу, якая непасрэдна не датычыць выдатнага канцэрта, пра які ішла гутарка ў гэтых нататках, але мае дачыненне да творчага росту калектыву Дзяржаўнага сімфанічнага аркестра БССР. Справа вось у чым. Тое, што кіраўніцтва філармоніі і аркестра надае вялікую ўвагу выкананню твораў сучасных аўтараў (на жаль, гэтай увагай чамусьці не карыстаецца творчасць беларускіх кампазітараў), трэба, безумоўна, вітаць. Але наглядаецца нейкі рэпертуарны схіл аркестра ўбок ад прапаганды класічнай спадчыны. На прыкладзе канцэрта пад кіраўніцтвам Джона Гопкінса можна ўбачыць, якое вялікае творчае значэнне для росту, удасканалення майстэрства калектыву мае не толькі запрашэнне на гастролі выдатных дырыжораў, але і выкананне яркага класічнага рэпертуару.

І. НІСНЕВІЧ.

НА КАЛГАСНАЙ СЦЭНЕ

У калгасе імя Мічурына Бабруйскага раёна любяць песні і ўмеюць іх хораша спяваць. Вось сёстры Гацько—Люба, Вольга, Каця і Дуся. Галасістыя дзяўчаты. І на работу і з работы ідучы спяваюць. Іх так і называюць у калгасе — «нашы сёстры Фёдаравы».

Настаўніца Соф'я Дзям'янчык спявае таксама звонка, прыгожа, яе заўсёды прыемна слухаць. Па ініцыятыве Соф'і Іванаўны і яе мужа—загадчыка Цялушскага клуба Івана Дудаля ў калгасе стварылі хор, праўда, пакуль яшчэ невялікі. Выступалі на сваёй сцэне, а пасля з канцэртам пабывалі ў суседнім калгасе «Гігант», у клубах раёна.

У рабоце прыходзіць сталасць. Спачатку спявалі народныя песні ў традыцыйнай манеры — ва унісон з падгалоскамі. Пасля развучылі ў два галасы песню «Любы зоры залацістыя». Цяпер у хоры трохгалоснае і чатырохгалоснае спяванне. У яго рэпертуары народныя песні і песні савецкіх кампазітараў.

Ёсць у спевакоў адна задума—да фестывалю самадзейнага мастацтва развучыць карагод. Памагчы калгасным артыстам узяўся інструктар нашага Дома культуры Ул. Куварын. Стварылі танцавальную групу. Цяпер ідуць рэпетыцыі першага карагода «Пойдзем, пойдзем лугам».

Вельмі хочацца, каб спроба адрадзіць народны карагод удалася самадзейнаму калектыву.

Г. РАЖКОВА,
дырэктар Бабруйскага раённага Дома культуры.

ТЭАТР—ТРЫБУНА ВЯЛІКАЙ ДУМКІ

СЛОВА ЎДЗЕЛЬНІКАЎ НАРАДЫ

Гарачая, шчырая размова кроўна зацікаўленых у развіцці тэатральнага мастацтва людзей — такое ўражанне на прысутных зрабілі выступленні ў спрэчках па дакладу М. А. Мінковіча. Выступаўшыя выказвалі задавальненне тым, што нарада, на якой пастаўлена самае надзённае для творчага жыцця тэатра і драматургаў пытанне, нарэшце, адбылася, бо праблемы сумеснай работы тэатраў і драматургаў сапраўды складаныя і неадкладныя. І ўсе сыходзіліся на адным: трэба, нарэшце, аб'яднаць усе наяўныя сілы, выкарыстаць магчымыя рэзервы, каб сустрэць вялікія даты ў жыцці нашага народа вартымі творамі.

Што неабходна зрабіць найперш? Умацаваць сувязі паміж тэатрамі і драматургамі — такой была агульная думка. Трэба, каб гэтыя сувязі былі арганічныя, а не выпадковыя, завязаліся «па загадзе сэрца», тады яны будуць сапраўды трывалыя і дадуць добры плён.

Выступаўшыя шмат гаварылі пра пошукі шляхоў ад «сэрца» драматурга да «сэрца» тэатра і наадварот. Час забыцца на былыя, часцей за ўсё ўяўныя, узаемныя крыўды, калі яны яшчэ помняцца, — гаварылі многія, — і разам, агульнымі намаганнямі зрушыць з месца наш нялёгкі рэпертуарны «воз».

— Становішча, якое перажываюць тэатры з рэпертуарам, — сказаў К. Губарэвіч, — не толькі наша мясцовая, так сказаць, бяда. І на Украіне, і ў РСФСР, і ў іншых рэспубліках справа з рэпертуарам абстаіць не намнога лепш. Сапраўды, спектакляў па новых п'есах, якія сталі б з'явай, падзеяй культурнага жыцця, у апошні час не было. Мне здаецца, прычына гэтага ў тым, што ў апошнія пяцьшэсць год тэатр апынуўся ў палоне своеасаблівага натуралізму, з аднаго боку, бясплённага эксперыментавання — з другога. Нашы сцэны запаланілі «модныя» п'есы, якія не маглі стаць крыніцай сапраўднага наватарства, глебай адухоўленай творчасці акцёра і рэжысёра. Іх героі, гэтыя модныя дзяўчынкі і хлопчыкі, нічога, апроч рэфлексіі, не маюць за душой. І нашы беларускія тэатры ставілі такія п'есы, хоць доўгі час, трэба аддаць ім належнае, яны гераічна змагаліся супраць моднай пошасці, шукаючы п'ес, патрэбных народу. Тым не менш, агульнае захапленне новым не мінула і нашых тэатраў. І яны паставілі нямала спектакляў, якія не прынеслі ні лаўраў іх стваральнікам, ні задавальнення гледачам. Магчыма, таму і маўчалі ў гэтыя гады многія нашы драматургі, бо яны страцілі ў асобе тэатраў сваіх аднадумцаў. Маўчалі не таму, што баяліся праслыць старамодным, а хутчэй не жадаючы падладжвацца. Цяпер, пасля XXIII з'езда партыі, становішча мяняецца. Партыя яшчэ раз напомніла нам, што тэатр — гэта высокая трыбуна, і выступаць з яе мае права той, каму ёсць што сказаць людзям. Наш тэатр — гэтага патрабуюць час і глядач — павінен стаць трыбунай вялікай думкі.

— За апошні ж час, — працягвае сваю думку прамоўца, — сувязі, якія раней існавалі паміж тэатральнымі калектывамі і пісьменніцкай грамадскасцю, вельмі паслабелі. Страчана атмасфера ўзаемнай зацікаўленасці і добразычлівасці, узаемадапамогі і павагі. Раней нашы тэатры ставілі штогод па трычатыры арыгінальныя беларускія п'есы. І нават канкурыравалі паміж сабою — хто паставіць лепш і хутчэй. Успомнім хоць такіх рэжысёраў і кіруючых работнікаў тэатра, як Саннікаў, Міцкевіч, Міровіч, Дорскі, Співак. Гэтыя людзі былі горача зацікаўлены ў стварэнні арыгінальнага рэпертуару. І не дзіва, што паміж тэатрамі і драматургамі адразу ж усталёўвалася атмасфера чуласці, прыязнасці і ўзаемадапамогі. Цяпер на змену ім прыйшлі новыя людзі. І яны павінны памятаць, што прыйшлі ў нацыянальны тэатр, і справа яго ўзняцца на новую ступень, справа яго абнаўлення і ўзбагачэння павінна стаць справай іх жыцця, іх гонару.

— Сённяшняя наша нарада, — сказаў галоўны рэжысёр тэатра імя Янкі Купалы Б. Эрын,—з'яўляецца для нас і доўгачаканай і жыццёва неабходнай. Нашы калектыўныя развагі, наш агульны роздум, трэба спадзявацца, дадуць плён. Мы павінны знайсці новыя шляхі вырашэння праблем беларускай драматургіі і жыцця беларускага тэатра на гэтай аснове. Сёлетняя гастролі тэатра імя Янкі Купалы ў Кіеве паказалі, што творы беларускай драматургіі, такія, як нестарэючая «Паўлінка» і «Лявоніха на арбіце», а таксама нядаўна пастаўленыя «Людзі на балоце» і «Выклік багам», з'явіліся тым прыцягальным магнітам, што прывабіў увагу кіяўлян да беларускай тэмы, да беларускага тэатра.

Б. Эрын у сваім выступленні падзяліўся роздумам аб тым, якім павінен быць, на яго думку, сучасны тэатр. Псіхалагічны тэатр, — гаварыў ён, — патрабуе ад мастака вялікага багацця душы і інтэлекту. Глядач чакае ад аўтара і выразніка яго думак — акцёра — адкрыцця новага, нязнанага і ў той жа час блізкага, хвалюючага.

Цікавыя думкі выказаў прамоўца адносна новага зместу, які неабходна ўнесці ў паняцце народнасці сёння, калі культура беларускага народа непараўнана ўзрасла, калі інтэлігентнасць становіцца адметнай рысай і рабочага і калгасніка, калі надыходзіць час, так сказаць, усенароднай інтэлігентнасці.

— Прынята, — гаворыць Б. Эрын, — падзяляць драматургію на бытавую і інтэлектуальную і, адпаведна, на такія ж катэгорыі падзяляць акцёраў і драматургаў. Тут, мне здаецца, наша вялікая памылка. Тэатр не цікавіць катэгорыя. Яму патрэбна добрая п'еса, а добрая п'еса — гэта твор, які прымушае гледача не толькі глядзець, сачыць за падзеямі, часам перажываць, хвалявацца, але і **думаць.**

Аб прыцягненні новых маладых сіл у драматургію, аб іх выхаванні гаварылі дырэктар тэатра юнага гледача А. Вольскі і мастацтвазнаўца Ул. Няфёд. Прыклады клапатлівага выхавання драматурга «на месцы» нагадаў А. Вольскі.

— Сапраўды, — сказаў ён, — ці стаў бы драматургам сельскі настаўнік Іван Козел, калі б не шчырая зацікаўленасць усяго калектыву тэатра і яго тагачаснага рэжысёра Л. Мазалеўскай у лёсе першай п'есы аўтара? І дзякуючы чулым адносінам да першай п'есы маладога драматура, за ёю з'явілася другая. Абедзве яны ідуць на сцэне тэатра. Гэтыя традыцыі выхавання «сваіх» аўтараў, «адкрыцця» новых імён тэатр не занядбаў. Цяпер мы працуем з новымі аўтарамі — Ул. Мехавым і І. Пісьменнай, неўзабаве спадзяёмся атрымаць ад іх канчатковыя варыянты твораў, у якіх маюць пільную патрэбу і тэатр і яго глядач. Ёсць у нас некаторыя творчыя задумы — гэта пастаноўка казак Васіля Віткі. Яго герой Вася Вясёлкін мог бы стаць сцэнічным братам Бураціна і Чыпаліна.

Многія прамоўцы горача падтрымлівалі і развівалі думку даклада М. Мінковіча аб папаўненні рэпертуару за кошт інсцэніровак твораў прозы і паэзіі.

— Трэба па-гаспадарску глянуць на нашу літаратурную спадчыну, — сказаў Ул. Няфёд. — Сапраўды, чаму б не інсцэніраваць творы Якуба Коласа і Янкі Купалы? Гэта ж павінна быць усім нам сорамна, што ў рэпертуары тэатраў імя выдатных паэтаў (апрача адной «Паўлінкі» на купалаўскай сцэне) няма твораў карыфеяў беларускай літаратуры. А ў Коласа ж ёсць і «Новая зямля», і «Рыбакова хата». Яны ж просяцца на сцэну. Апошнім часам на сцэну інсцэніроўка выходзіць усё часцей. Час перастаць глядзець на яе як на твор другога гатунку. Наша сённяшняя проза і паэзія так багата яркімі думкамі, цікавымі характарамі, сапраўды драматычнымі канфліктамі і сітуацыямі, што не будзе нічога благога, калі, прызначаныя для п'ес, але вакантныя пакуль месцы зоймуць інсцэніраваныя творы нашых лепшых празаікаў і паэтаў.

Выступаўшыя ўспомнілі і пра аўтарскія рэзервы, на якія так багаты нашы тэатры. У нас ёсць вопытныя акцёры і рэжысёры, якія з поспехам маглі б не толькі ставіць спектаклі па чужых п'есах, але і інсцэніраваць твор іншага жанру. Дарэчы, гэта ўжо там-сям робіцца, і не беспаспяхова. Варта хоць бы назваць работу З. Браварскай і Т. Абакумоўскай над раманам І. Мележа «Людзі на балоце» ці Ю. Арынянскага над раманам І. Шамякіна «Сэрца на далоні».

— Без арыгінальнай драматургіі немагчыма гаварыць ні пра аблічча тэатра, ні пра яго почырк, — сказаў у сваім выступленні галоўны рэжысёр тэатра імя Ленінскага камсамола Беларусі Г. Волкаў. — Тэатр павінен мець сваіх драматургаў. МХАТ — гэта Чэхаў і Горкі. Не было б іх — не было б і МХАТа. Драматургія вызначае аблічча, почырк, характар тэатра. Нам вельмі нестае маладых драматургаў, якія б вывелі на сцэну нашага маладога сучасніка-беларуса, рабочага, калгасніка, пагранічніка. Дарэчы, пра калгасную тэму. У тых п'есах, якія мы чытаем, а часам іграем, старшыня калгаса чамусьці абавязкова ці злодзей, ці абібок, ці проста недарэка, які ніяк не здолее арганізаваць работу. Усе канфлікты ў такіх п'есах надзвычай прымітыўныя. А ў нашай вобласці старшыні калгаса — гэта Героі Сацыялістычнай Працы Ралько, Уласюк. І ніхто не напіша пра іх п'есу. Вось і атрымліваецца, што мы, не хочучы таго, скажаем рэчаіснасць, ставячы ўстарэлыя п'есы.

Думкі Г. Волкава падзяляе галоўны рэжысёр Рускага драматычнага тэатра імя М. Горкага А. Даброцін. Разам з тым А. Даброцін гаворыць аб выхаваўчай ролі тэатра, яго абавязку змагацца за выхаванне новага чалавека, за выхаванне ў гледача добрага густу, які часам тэатры самі псуюць, непатрабавальна ставячыся да складання рэпертуару.

А. Даброціна падтрымлівае галоўны рэжысёр Магілёўскага тэатра Б. Валадарскі. Ён лічыць, што на сцэну можна выпускаць толькі дасканалы, закончаны твор, і скардзіцца на тое, што над пастаноўкай арыгінальных п'ес рэжысёры вымушаны працаваць спяшаючыся, бо штогод трэба выпусціць восем-дзевяць спектакляў.

Клопатам аб змесце сучаснай драматургіі было прасякнута выступленне драматурга П. Васілеўскага.

Некалі наш нашчадак, які будзе разумнейшы за нас і смялейшы, — сказаў у прыватнасці ён, — зацікавіцца сённяшняй гісторыяй нашага грамадства і паспрабуе прасачыць яе па нашых п'есах. Баюся, што калі ён здолее ўявіць сабе тое, што мы зараз часам паказваем нашаму гледачу, нам не паздаровіцца. Ён не ўбачыць нашых сучаснікаў такімі, якія яны ёсць, бо, сапраўды, калі паспрабаваць уявіць сабе карціну нашага жыцця па некаторых драматургічных творах, то атрымаецца нейкае вельмі дзіўнае грамадства. Наш народ перажыў найвялікшыя падзеі сусветнай гісторыі, здзейсніў рэвалюцыю, выстаяў у войнах. На нашых вачах адбываецца станаўленне новага чалавека. Усё гэта павінна быць адлюстравана і прааналізавана ўсімі сродкамі мастацтва, у тым ліку і ў тэатры.

Рэпертуар тэатра залежыць іншы раз ад такой простай рэчы, як своечасовая інфармацыя.

— Я маю на ўвазе інфармацыю аб тым, над чым працуюць нашы драматургі, — сказаў рэжысёр Магілёўскага тэатра Б. Валадарскі. — Толькі тут, на гэтай нарадзе, я пачуў, што пішацца і ўжо заканчваецца шмат беларускіх п'ес, што ў Гродна тэатр ставіць п'есу М. Гарулёва, што заканчваюць свае п'есы А. Макаёнак і К. Крапіва. Значыць, дрэнна пастаўлена справа інфармацыі. Трэба, каб мы маглі чытаць усе п'есы, якія трымае ў сваім партфелі рэпертуарная калегія Міністэрства культуры, і мелі магчымасць выбраць з іх тое, што нам неабходна.

У выступленнях М. Гарулёва, І. Міхалюты і іншых крытыкавалася работа секцыі драматургаў Саюза пісьменнікаў БССР.

— Сапраўднай творчай работы, узаемнай зацікаўленасці ў секцыі няма, — кажа М. Гарулёў. — Кожны працуе сам па сабе. Таму гаварыць пра секцыю як пра творчую ячэйку пакуль немагчыма. Добра было б, каб намаганні рэпертуарна-рэдакцыйнай калегіі Міністэрства культуры і секцыі драматургаў аб'яднаць. Тады можна было б зрабіць значна болей.

— Мне здаецца, — гаворыць І. Міхалюта, — што секцыя драматургаў Саюза пісьменнікаў не мае ўплыву на работу пісьменнікаў. А даўней жа нашы лепшыя паэты і празаікі не грэбавалі працай для тэатра і пісалі добрыя п'есы. Па прыклады далёка хадзіць не трэба. Гэта і Я. Колас, і Я. Купала, і К. Крапіва, і В. Вольскі, і Э. Самуйлёнак, і многія-многія іншыя.

Няблага было б шырэй абмяркоўваць драматычныя творы ў Саюзе пісьменнікаў. Не толькі на секцыі драматургаў. Мо і паболшала б тады ахвотнікаў пісаць не толькі для выдавецтва, а і для тэатра.

— Адной з прычын складанага становішча з рэпертуарам нашых тэатраў з'яўляецца тое, што драматургам вельмі цяжка наладжваць кантакт, сувязь з тэатрам, — сказаў І. Мележ. — Мне здаецца, што ў такім становішчы нашы драматургі больш заставацца не могуць. Мусяць быць нейкія перамены, драматургам павінна быць адкрыта шырокая дарога, каб лягчэй ім жылося ў тэатрах. Для нас, драматургаў, самым галоўным з'яўляецца зараз сустрэць у тэатры аднадумца ў асобе рэжысёра. Калі ў асобе рэжысёра мы будзем мець таленавітага чалавека, то можна лічыць, што драматург у саюзе з рэжысёрам даб'ецца поспеху. Мне здаецца, што падтрымка рэжысёра ў яго самааддаданай працы з драматургам павінна быць усебаковай, у тым ліку і матэрыяльнай.

Было б вельмі добра, каб кожны рэжысёр за гады сваёй работы вывеў на сцэну хаця б аднаго-двух драматургаў. А між тым у нас нямала такіх рэжысёраў, якія за шмат гадоў не дапамаглі стаць на ногі ніводнаму маладому аўтару.

Неаднаразова на розных сходах і нарадах узнімалася пытанне аб матэрыяльным заахвочванні творчых работнікаў тэатраў — рэжысёраў і акцёраў, што працуюць над стварэннем арыгінальнага беларускага рэпертуару. Усплыло яно і на гэтай нарадзе. Амаль усе выступаўшыя падкрэслівалі, што матэрыяльнае заахвочванне рэжысёраў, якія працуюць над пастаноўкай арыгінальнай п'есы, — справа прадыктаваная самім жыццём. Варта было б адзначаць і акцёраў, і мастакоў, якія актыўна і плённа шмат гадоў працуюць над стварэннем нацыянальнага рэпертуару, сваім мастацтвам узнімаюць прэстыж беларускай драматургіі.

— Паўтара дзесяцігоддзі ідзе на сцэне Брэсцкага тэатра імя Ленінскага камсамола спектакль «Брэсцкая крэпасць», — гаворыць Г. Волкаў. — Даўно мінуў яго пяцісоты, юбілейны, так сказаць, паказ. Колішнія маладыя акцёры, такія, як Уласаў, што іралі сваіх равеснікаў-лейтэнантаў, ужо самім жыццём—мінула ж пятнаццаць год! — «павышаны ў чыне»: іграюць сёння палкоўнікаў. А на ролі маладзенькіх лейтэнантаў уведзены выпускнікі тэатральнага інстытута. Неўзабаве адбудзецца шасцісоты спектакль. Трэба ж неяк адзначыць «ветэранаў» «Брэсцкай крэпасці» — акцёраў, натхнёнай творчасці якім спектакль таксама абавязаны сваім доўгім і слаўным жыццём. Тут, побач з маральным прызнаннем, была б вельмі дарэчы і матэрыяльная ўзнагарода.

— Сапраўды, — кажа К. Губарэвіч,—вось у Віцебску «Несцерка» ідзе дваццаць пяць год. Штогод тэатр імя Я. Коласа адкрывае гэтым спектаклем свае гастролі. Твор мае ўсесаюзны рэзананс, таксама як і «Паўлінка» ў купалаўцаў. Я не ведаю, як тэатры адзначылі такую самаадданую работу над гэтымі спектаклямі-ветэранамі. А адзначыць трэба было. І людзей, што гэтулькі год трымалі спектаклі «ў форме».

Усе аднадушна выказалі надзею, што пытанне матэрыяльнага заахвочвання за работу над стварэннем беларускага арыгінальнага рэпертуару будзе, нарэшце, вырашана станоўча.

Падводзячы вынікі нарады, М. Мінковіч сказаў:

— Я думаю, што выкажу агульную думку: да 50-годдзя Савецкай улады мы прыйдзем з поспехамі ў галіне драматургіі. Можна спадзявацца, што кожны драматург, кожны тэатр зробяць усё, што ад іх залежыць, каб сустрэць вялікую дату высокамастацкімі, палымянымі творамі.

ІДЗЕ «МЕСЯЧНІК САДУ»

Калі глядзіш на гэтыя кволыя прышчэпы, дык і не верыцца, што некалі з іх вырастуць вялікія дрэвы. Але так яно і будзе. Тысячы гектараў новых садоў закладваецца ў гэтыя восеньскія дні на Гродзеншчыне. Толькі адзін плодагадавальнік «Грандзічы» вучэбнай гаспадаркі «Станіславава» Гродзенскага сельскагаспадарчага інстытута прадасць калгасам, саўгасам і насельніцтву вобласці каля 60 тысяч прышчэпаў яблынь, груш, сліў, вішань.

Вось і цяпер брыгадзір Антон Мікалаевіч Чараміс і работніца гадавальніка Ніна Канстанцінаўна Скамарошка правяраюць прышчэпы перад адпраўкай у калгасы і саўгасы.

Фота А. ПЕРАХОДА. (БЕЛТА).

НЕЗВЫЧАЙНАЯ ЗАБАСТОЎКА

Пагадзіцеся, не так ужо часта даводзіцца чуць пра забастоўкі артыстаў. Аднак старонкі нарвежскіх газет больш чым тыдзень былі запоўнены паведамленнямі пра такую незвычайную забастоўку. Незвычайную, але не нечаканую: творчыя работнікі тэатраў Нарвегіі не адзін раз спрабавалі прыцягнуць увагу ўлад і грамадскасці да ўмоў сваёй работы. Яны ставілі пытанне аб павышэнні заработнай платы, імкнуліся дамагчыся хоць бы аднаго выхаднога дня на тыдзень і павелічэння працягласці адпачынку. Але тэатральнае таварыства Нарвегіі з упартасцю, вартай лепшага выкарыстання, адхіляла патрабаванні акцёраў.

І вось 7 верасня дзверы тэатраў у Осла і ў іншых гарадах краіны зачыніліся. Усе артысты—праслаўленыя зоркі і безыменныя статысты—не выйшлі на работу. Забастоўка стала фактам.

Буржуазная прэса нямала папрацавала, каб падарваць маральны дух і волю бастуючых. Газеты спрабавалі напалохаць артыстаў магчымасцю фінансавага краху некаторых тэатраў, г. зн. па сутнасці перспектывай беспрацоўя. «Дагбладэт» выразна намякала на тое, што дзеянні артыстаў ставяць пад удар тэхнічны персанал тэатраў—бо гардэробшчыкі і білецёры перастануць атрымліваць заработную плату.

Гэтая ж газета апублікавала артыкул Тормада Скагестада пад недвухсэнсавай назваю «Забастоўка без мэты і сэнсу». Аўтар гэтага артыкула так настойліва гаворыць пра «бязмэтнасць і бессэнсоўнасць» дзеянняў Саюза нарвежскіх артыстаў, што проста дзіву даешся: з чаго б гэта ім уздумалася баставаць? У іншых, маўляў, краінах акцёры працуюць нават больш, чым у Нарвегіі. Да таго ж, маўляў, існуе пагадненне, у адпаведнасці з якім нарвежскія артысты павінны працаваць не менш чым 310 дзён у год, і гэтае пагадненне не можа быць перагледжана раней 1968 года. Дзе ж тут гаварыць пра адзін выхадны дзень на тыдзень, а тым больш пра павелічэнне працягласці адпачынку! Ну, а што датычыць павелічэння заработнай платы, дык грошай проста няма адкуль узяць. Безвыходнае становішча ды і толькі.

Аднак выйсце ёсць, і яно было названа газетай нарвежскіх камуністаў «Фрыхетэн». Сапраўдные мастацтва, пісала «Фрыхетэн», можа нараджацца толькі ва ўмовах, якія стымулююць творчую працу. Трэба адкрыць дарогу на сцэну сацыяльнаму заканадаўству, якое існуе для работнікаў іншых прафесій. Выйсце «Фрыхетэн» бачыць ва ўзмацненні грамадскай і дзяржаўнай падтрымкі тэатра. Пры гэтым яна адхіляе як беспадстаўнае сцвярджэнне, быццам фінансавая падтрымка збоку пазбавіць мастацтва неабходнай яму свабоды думкі і творчасці. Бо іменна там, дзе тэатры працуюць пры поўнай падтрымцы грамадства, назіраюцца найбольш выдатныя сцэнічныя дасягненні.

Нават частка буржуазнай прэсы была вымушана ў нейкай меры прызнаць правамернасць патрабаванняў, выстаўленых бастуючымі. Практычнае вырашэнне канфлікту, прынамсі, часовае, было знойдзена. Забастоўка скончылася перамогай артыстаў. Яны атрымалі надбаўку да заработнай платы. Абяцана перагледзець таксама ўмовы працы. Такім чынам, забастоўка мела і сэнс і мэту. Што ж датычыць шырокага абмеркавання пытання, прапанаванага газетай нарвежскіх камуністаў, дык хочацца верыць, што ў выніку яго тэатральнае мастацтва Нарвегіі, на славу якога тварылі вялікія Грыг і Ібсен, зойме вартае месца ў культурным жыцці краіны.

Сяргей ЧАРКАСАЎ.
(ТАСС).

ТЭЛЕБАЧАННЕ

18 кастрычніка

Першая праграма. 16-40 — праграма перадач. 16-45—для школьнікаў. «Пытаемся — адказвайце». Навукова-пазнавальная віктарына (М). 17-10 — для школьнікаў. «Рознакаляровыя гальштукі» (М). 17-30 — дзіцячы экран. «Пеця і Чырвоная шапачка». «Пра бегемота, які баяўся прышчэпак». Мультыплікацыйныя фільмы. 18-00 — тэлевізійныя навіны. 18-20 — для слухачоў пачатковай палітшколы. Біяграфія Ул. І. Леніна. «Правадыр рэвалюцыйнага пралетарыята Расіі. Перадача другая з Ленінграда. 18-50 — да 50-годдзя Савецкай улады. «Дарога даўжынёю ў сто гадоў». Перадача з Віцебска. 20-10 — Дні польскай навукі і тэхнікі ў БССР. «Для павышэння ўраджаю». Навукова-папулярны фільм. 20-30 — тэлевізійныя навіны (М). 21-00 — «Табе, юнацтва!» (М). 21-40 — тэатральныя сустрэчы. Артысты Ленінградскага акадэмічнага Вялікага драматэатра імя М. Горкага ў гасцях у масквічоў (М). 23-10 — першынство свету па цяжкай атлетыцы. Перадача з ГДР.

Другая праграма. 11-00 — тэлевізійныя навіны (М). 11-15 — для дашкольнікаў і малодшых школьнікаў. «Умелыя рукі» (М). 17.30 — «Сельская навіна» (М). 18-00 — тэлевізійныя навіны (М). 18-20 — да 50-годдзя Савецкай улады. «Начны рэйс». «Латышскія стралкі». Кінанарысы. 18-50 — «Навіны будаўніцтва». Кінажурнал (М). 19-00 —канцэрт ансамбля электраінструментаў пад кіраўніцтвам В. Мяшчэрына (М). 19-40 — М. Гогаль. «Нос».